Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі!
ФРАНЦІШАК БАГУШЭВІЧ

НАША СЛОВА

ТАВАРЫСТВА БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ ІМЯ ФРАНЦІШКА СКАРЫНЫ

Газета выходзіць з сакавіка 1990 года № 30(415) 28 ЛІПЕНЯ 1999 г.

27 ліпеня

9-я ўгодкі прыняцце Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце Рэспублікі Беларусь-аб'яўленне незалежнасці Рэспублікі Беларусь

Незалежнасць

Светлы дзень, светлы час. Незалежнасць
Лашчыць сэрцы, і душы, і лёс.
Светлы дзень, светлы час. Непазбежнасць
Нашай волі ідзе ад нябёс.

Мы акрылены вечнай надзеяй,
Нашых мараў штандары шумяць,
Нашых мрояў заранка ірдзее,
Нашых думак канём не дагнаць.

Мы паходняй святой непакоры
Разганяем бязвольнасці цвіль,
Мы ідзём на свабоды прасторы,
Мы выходзім са змроку магіл.

А навокал ваўкі з крумкачамі
Шчэраць зяпы на нашу зямлю,
Мой народ, ты з пустымі рукамі
Не адстоіш свабоду сваю.

Ты адкрытай мазольнай далонню
Мусіш толькі даваць і даваць,
Талент, хлеб і дзяцей у прадонне,
Унахабную прорву кідаць.

Дык пастаў ты далонь тую рубам,
А шчэ лепей зацісні ў кулак,
Скрыгатні хоць затворам, хоць зубам
І прыпомні, што ты быў ваяк.

Ад твае ваяўнічае славы
Шмат дрыжалі і Захад і Ўсход.
Ты нашчадак вялікай дзяржавы,
Мой забіты, гаротны народ.

Мы сыны твайго вечнага болю,
Мы паўсталі ў апошні мо раз,
Мы заплацім за волю сабою,
Ты вазьмі, ты вазьмі толькі нас,

Ты вазьмі нашу смеласць і сілу,
Нашай кроўю свой сцяг акрапі,
І хай нашыя будуць магілы
Для цябе, як памежжа слупы,

Каб ніколі, ніколі, ніколі
Ты не мог больш назад адысці
Са святое дарогі да волі,
З найцяжэйшай дарогі ў жыцці.

25.10.1991 г. ***Станіслаў Суднік.***

Віншуем!

Шырокавядомаму, асабліва ў дэмакратычных колах, дзеячу беларускай песеннай культуры Алесю Галічу спаўняецца 30 гадоў.

Ужо працяглы час яго культурна-асветніцкая дзейнасць прыносіць плён, раскрываючы людзям Беларусі, асабліва моладзі, бязмежныя багацці, глыбокую духоўнасць і непаўторную прыгажосць беларускай песні.

Прычым, ён сам—выдатны выканаўца лірычных, патрыятычных і іншых песень. Яго прыгожы, гучны голас яскрава даносіць да кожнага слухача і змест і мелодыю, абуджаючы гонар і пачуццё самапавагі кожнага беларуса.

Нястомная дзейнасць са школьнымі гурткамі, актыўны ўдзел у занятках-сустрэчах са студэнтамі ВНУ, вучэльняў, школьнікамі, якія ладзіць Рада ТБМ Кастрычніцкага раёна, кіраванне хорам БНФ – гэта толькі частка дзейнасці спадара Алеся.

Ад усёй душы зычым нашаму шаноўнаму спадару Алесю Галічу моцнага здароўя, творчага натхнення і поспехаў у святой справе адраджэння і вызвалення Маці-Беларусі.

Шануй цябе Бог.

Па даручэнні Рады ТБМ Кастрычніцкага раёна Ян Грыб

11.07.99г.

Аўтару слоўніка мовы Скарыны - 75

20 ліпеня споўнілася 75 гадоў вядомаму мовазнаўцу, заслужанаму дзеячу навукі, доктару філалагічных навук Уладзіміру Анічэнку. Уладзімір Анічэнка ў 1988 годзе правёў комплекс даследчыцкіх прац "Скарыніяна", за што атрымаў дзяржаўную прэмію БССР. Ён вёў глыбінныя даследванні ўсходнеславянскіх моў, выдаў многа прац па гэтай тэматыцы. Адна з асноўных яго работ - трохтомавы "Слоўнік мовы Скарыны". Пад яго кіраўніцтвам і пры непасрэдным удзеле падрыхтаваны "Слоўнік мовы Янкі Купалы". Выдаў рукапісы помніка старажытнай беларускай пісьменнасці "Александрыя"і зборнік 19-га стагоддзя "Беларускі казачны эпас".

Сакратарыят ТБМ сардэчна віншуе Уладзіміра Васільевіча з юбілеем, зычыць здароўя і просіць яшчэ паслужыць Беларусі.

Шаноўныя беларусы Мельбурна!

Сакратарыят Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны і рэдакцыя газеты "Наша слова" ад усёй душы вітаюць вас у далёкай Аўстраліі.

Прыміце нашую шчырую ўдзячнасць за тыя 170 амерыканскіх даляраў, якія вы даслалі на газету "Наша слова". За гэтыя грошы быў аплочаны друк трох нумароў нашай газеты. Нам вельмі прыемна, што недзе за тысячы кіламетраў жывуць шчырыя беларусы, што там б'юцца беларускія сэрцы за нашую агульную Бацькаўшчыну, за нашую справядлівую беларускую справу. У свой час вы паклалі свае лёсы, жыцці, здароўе за вольную Беларусь. Вас не зламалі дзесяцігоддзі змагання. Вы не страцілі надзеі. І сёння ў наш цяжкі час, калі маскоўскі хамут зноў пхаюць на шыю рахманаму беларускаму каню, вы прадаўжаеце падтрымліваць адраджэнцкія сілы, робіце важкі ўнёсак у нашую непазбежную перамогу. Шчыры вам "дзякуй".

Мы ад усёй душы зычым вам плёну ў працы на карысць Беларусі, каб у многіх пакаленнях беларусы Аўстраліі засталіся беларусамі і вернымі сынамі сваёй гістарычнай Радзімы.

Старшыня Рэспубліканскай Рады ТБМ імя Францішка Скарыны
Алег Трусаў.
Рэдактар газеты "Наша слова"
Станіслаў Суднік.

Беларускія СМІ пра беларускую мову

ЗАХІНЕМ ПІКЕТАМ МОВУ

На мінулым тыдні Таварыства Беларускай Мовы імя Францішка Скарыны зладзіла свой чарговы пікет – толькі якая карысць з гэткіх пікетаў?

Мова наша жыве, не пакінутая, сям-там: у вёсцы, сярод малапісьменных людзей, не навучаных праз гэта расейскай, і ў гарадзкіх нацыянальна-сьведамых асяродках. Але ні тым, ні тым дзейнасць ТБМ нічога не дае.

Калі няма магчымасьці вучыць людзей гаварыць па-беларуску, дык трэба стварыць узор гэткага "размаўлення". Найперш – колькі ўжо пра гэта ішлося! – самыя актывісты нежалежніцкага руху мусяць размаўляць па-беларуску ня толькі " па працы", а паўсюль. А зайдзіце ў сядзібу ТБМ, з вамі павітаюцца "Здраствуйце!" – і запытаюцца: "Вы к каму?"

Да пікетаў прыходзяць людзі – з надзеяй, што нешта зьменіцца, што нешта можна зьмяніць. А ім падсоўваюць газэту "Наша слова": справаздачы, заявы, і скаргі, і ўсё – дубовай мовай. Ну, не чыталі ў ТБМ клясыка: "Кінь вечны плач свой аб старонцы!"

В.М.
"Наша Ніва" № 13, 5 ліпеня 1999 г.

Нядаўна ў газеце "Наша Ніва" быў надрукаваны артыкул невядомага аўтара ў якім зняважаецца як ТБМ цалкам так і наша газета.

На апошнім Сакратарыяце гэты матэрыял быў разгледжаны і мы даручылі нашаму адказнаму сакратару сп.Ірыне Марачкінай напісаць адказ у "НН" ад імя Сакратарыята. што і было зроблена.

У апошнім нумары "НН" гэты адказ у значна змененым варыянце быў надрукаваны. Таму мы друкуем у "НС" абодва матэрыялы без усялякіх скарачэнняў. Хай нашы чытачы самі ва ўсім разбяруцца, бо мы выступаем рашуча супраць нацкоўвання адных беларускамоўных выданняў на другія.

Для рэдакцыі "НН" мы асобна павядамляем, што ў нашай сядзібе захоўваецца транспарант наступнага зместу "Рукі прэч ад Нашай Нівы", з якім сябры ТБМ не адзін раз стаялі на сваіх пікетах, калі газеце пагражала закрыццё.

Мы можам падараваць яго на добры ўспамін невядомаму аўтару "НН", які схаваўся пад літарамі "В.М."

Алег Трусаў старшыня ТБМ імя Ф.Скарыны.
Менск, 21 ліпеня 1999г.

Захінем пікетам мову. А чаму б і не?

У "Нашай Ніве" (№ 13, 5 ліпеня 1999 года) быў змешчаны ліст пад назвай "Захінем пікетам мову". Аўтар гэтага ліста, схаваўшыся за ініцыяламі В.М., спрабуе давесці чытачам, што "дзейнасць ТБМ нічога не дае". У прыватнасці, ён не прымае такой пашыранай ва ўсім свеце формы пратэсту, як пікетаванне. "Якая карысць з гэтых пікетаў?" пытаецца аўтар. Мы не збіраемся некага пераконваць, нешта даказваць ці палемізаваць з гэтай нагоды. Вынікі нашых пікетаў – відавочныя.

Поўнасцю прымаем крытыку аўтара ліста ў адрас газеты "Наша слова". Для нас, сяброў ТБМ, гэта сапраўды балючае месца. І тут шаноўны аўтар В.М. трапіў у дзесятку, "укусіў", што называецца, за жывое. На нашу думку, "Наша слова" з'яўляецца своеасаблівым люстэркам, у якім, як підзе, адбіваецца сённяшні дзень нашай краіны. Гэта, калі хочаце, вобраз самога беларуса, які прагне выжыць у вар'яцкай сітуацыі. Але, зразумейце, без газеты Таварыства працаваць не можа. Нават, калі б на яе старонках, як сцвярджае В.М., знаходзіліся адно толькі "справаздачы, заявы і скаргі", напісаныя "дубовай мовай", яна нам неабходна. Таму крытычная заўвага аўтара ліста наконт "Нашага слова" – не навіна для нас. Мы разумеем, што калі б нехта, напрыклад, такі прафесійны публіцыст, як Сяргей Дубавец, узяўся прааналізаваць любы нумар нашага друкаванага органа, то ад яго жывога месца не засталося б – адны руіны. Дзякуй Богу, прыкладна 99,9 адсоткаў прыхільнікаў разам з намі церпяць гэты боль і, як могуць, дапамагаюць. Ад гэтага, нам здаецца, больш карысці. Зменіцца сітуацыя, скончыцца жабрацкае існаванне і "Наша слова" – мы ўпэўнены у гэтым – будзе, павінна быць (!) узорам мовы. У лісце "Захінем пікетам мову" ёсць і звычайныя бабскія плёткі наконт таго, што ў сядзібе Таварыства не чуваць беларускай мовы. Тут нават павітацца па-беларуску не ўмеюць.

Аднак, мы адчуваем, што аўтар ліста, як дарэчы, і "Наша Ніва", — наш прыхільнік, і, якой бы жорсткай з яго боку не была крытыка ў наш адрас, ён аб'ектыўна з'яўляецца прапагандыстам ТБМ.

Дарэчы, праца нашага Таварыства была заўважана нават афіцыйнымі СМІ. Нядаўна на Беларускім тэлебачанні ў "Палітычных дыялогах" вядучы ў гутарцы з міністрам асветы Васілём Стражавым не прамінуў пытання актывізацыі дзейнасці ТБМ і, шукаючы адказ на яго, выказаў меркаванне, ці не звязана гэта з 75-годдзем пачатку палітыкі беларусізацыі, датай, якую б мы маглі б абмінуць у мітусні будзённых спраў, асабліва цяпер, падчас кампаніі перарэгістрацыі.

Пра нас пішуць і іншыя газеты: "Народная воля", "Навіны", "Беларуская маладзёжная", "Пагоня", некаторыя дзяржаўныя. Думаецца, што гэта справядліва, бо мы не стаім на месцы, працуем, абуджаем людзей, каб яны, нарэшце, задумаліся пра моўную палітыку дзяржавы, якая, фактычна руйнуе нашую культуру, незалежнасць, Бацькаўшчыну.

Ліст "Захінем пікетам мову" абмяркоўваўся на Сакратарыяце ТБМ. Ён выклікаў розныя, часам супярэчлівыя меркаванні. некаторыя з якіх знайшлі сваё адлюстраванне ў гэтым адказе.

Напрыканцы дазволім сабе выказаць суб'ектыўнае меркаванне. На наш погляд у дэмакратычным друку не павінна быць публікацый, у якіх людзі займаюцца самаедствам. Гэта не ўпрыгожвае. Верым, што "Наша Ніва" і надалей не згубіць свайго статуса першай беларускай газеты. Ганарымся, што мы, як кажуць, у адной звязцы – помніцца, стаялі ў пікеце за "Нашу Ніву", баранілі тарашкевіцу, жылі разам на адной кватэры і да гэтага часу - у адной сям'і, якой з'яўляецца для нас Таварыства беларускай мовы.

Ірына Марачкіна, адказны сакратар ТБМ.
Па даручэнні Сакратарыята
15.07.1999г.

№ 30(415) 28 ЛІПЕНЯ 1999 г. Наша слова

“Не трэба канфрантацый!”

Выступленне на VI-ым з’ездзе ТБМ намесніка кіраўніка Адміністрацыі прэзідэнта Івана Пашкевіча

Шаноўнае спадарства! Шчыра вітаю ўсіх удзельнікаў VI з’езда. Адразу хачу выказаць вялікую падзяку Вам, Генадзь Мікалаевіч, што запрасілі.

Ці ёсць сёння падстава з такім болем гаварыць, абмяркоўваць праблему беларускай мовы? Я лічу, што ёсць. У сувязі з гэтым я стаўлю другое пытанне. Як вырашыць гэтую праблему, і хто яе будзе вырашаць? Пакуль мы спакойна, памяркоўна не разбярэмся з гэтымі двума пытаннямі, крок наперад – такі, які трэба – не зробім. Але, як дамагчыся, каб беларуская мова заняла сваё належнае месца – такое, якое яна павінна заняць – у нашай дзяржаве? Я казаў, кажу і буду казаць заўсёды: якую б пасаду ні займаў, колькі б гадоў на ёй ні працаваў, дзе б ні быў пасля, я прытрымліваюся той думкі, што адной з адметных рысаў характарыстыкі дзяржаўнасці з’яўляецца беларуская мова. І таму, я думаю, нам спрачацца не трэба, калі, напрыклад, Генадзь Мікалаевіч Бураўкін кажа, што ў нас навучаецца на беларускай мове 20% школьнікаў, а шаноўны Васіль Іванавіч Стражаў называе лічбу – 30%. Ды калі б мы назвалі значна большыя паказчыкі – 50%, 60% — гэта ўсё роўна вельмі кепска і сорамна для нас. Што рабіць у першую чаргу? Я лічу, што нам – падабаецца гэта каму ці не – трэба моўную праблему вывесці з палітыкі.

На жаль, на сённяшні дзень тут ёсць спекуляцыі, як з аднаго, так і з другога боку. Вы ведаеце становішча ў нашай дзяржаве і ведаеце тых людзей, якія працуюць у вертыкалі. Я таксама не баюся сказаць, што ёсць дурні і ў галіне сельскай гаспадаркі, у іншых. І ў гэтай таксама ёсць. Але будзем шчырымі. Не ўсе яны робяць, як кажуць, пагоду. Таму нам праблемай мовы трэба займацца спакойна. Ніколі не падзялю думкі тых, хто быў сёння на гэтай сцэне, ці дзе-небудзь яшчэ, што ў вертыкалі, ці нават на самым версе, людзі, якія працуюць з прэзідэнтам, - ворагі беларускай дзяржавы і беларускай мовы. Сёння ўмовы такія. Напрыклад, Пашкевіч, які стаіць перад вамі, займае пасаду намесніка кіраўніка Адміністрацыі прэзідэнта. Нешта ад яго на сённяшні дзень залежыць. Дык давайце працаваць са спадаром Пашкевічам спакойна. Давайце працаваць сёння з міністрам Стражавым. **Як я разумею, мы** павінны супрацоўнічаць. Я ніколі не скажу слоў крытыкі – і прасіў бы вас гэтага не рабіць – у адрас Падгайнага. Ён вельмі заняты – прыйшоў і пакінуў наш з’езд. Але ён робіць усё, што трэба рабіць. Я ніколі не падтрымаю словы крытыкі ў бок Стражава Васіля Іванавіча і ніколі не прыму словы крытыкі ў свой адрас. Калі ласка, супрацоўнічайце з намі, мы руку вам працягваем. Заўтра будзеце вы – займайцеся гэтымі справамі яшчэ лепей. (Гэта я кажу Паўлу Знаўцу). Як я бачу гэтае супрацоўніцтва? Тое, што сёння было сказана шмат добрага і ва ўступным слове Генадзя Мікалаевіча, і ў выступленнях іншых, я лічу гэта станоўчым падыходам Таварыства беларускай мовы да грамадскіх аб’яднанняў. Сёння ў гэтай зале ніхто не ўспомніў, хто ўтварыў ТБМ. А гэта тыя ж Міністэрства адукацыі, Нацыянальная дзяржаўная тэлерадыёкампанія, Саюз пісьменнікаў і г.д. Мы павінны шукаць розныя спосабы, каб займацца прапагандай нашага беларускага слова. І вельмі добра , што ТБМ з маім удзелам пачало рабіць стасункі з Саюзам пісьменнікаў. На жаль недзе ў раёнах ёсць людзі, якія пужаюцца беларукага слова. Ёсць і такія, якія хочуць бегчы ўперадзе паравоза. Таму давайце прапаганду слова, камандзіроўкі супрацоўнікам Таварыства беларускай мовы рабіць праз Саюз пісьменнікаў. Давайце не крытыкаваць. Крытыкаваць ёсць за што. Я гатоў удзельнічаць у тым, каб сесці разам Саюзу пісьменнікаў, ТБМ, Нацыянальнай тэлерадыёкампаніей і распрацаваць нейкія сумесныя перадачы.

Адносна таго, што сказаў тут шаноўны спадар Лыч. Ні я, ні мае паплечнікі, якія займаюць такія пасады, як я, ніколі не гаварылі, што аб’яднанне з Расеяй – гэта паглынаннее беларускай культуры. Узгадаю словы міністра культуры Сасноўскага, які, на жаль, не прысутнічае на нашым з’ездзе, бо знаходзіцца ў адпачынку. Ён гаварыў, што беларус, рускі, яўрэй, літовец адрозніваюцца адно ад аднаго, бо з’яўляюцца носьбітамі сваёй нацыянальнай культуры. У кожнага ёсць адметныя рысы. Зноў заклікаю – не трэба канфрантацый. Давайце, шаноўны Генадзь Мікалаевіч, з Міністэрствам адукацыі, калі ёсць пытанні, спакойна – так, як было на “круглым стале”, матэрыялы якога надрукаваны ў “Звяздзе”, з якімі я з задавальненнем пазнаёміўся, — пашукаем пункты супрацоўніцтва.

Гэта вельмі кепска, калі нашы аб’яднанні, якія карыстаюцца, скажам, вельмі гучным словам у нашым грамадстве, вядуць да расколу сваёй арганізацыі. Вы ўсяго не ведаеце. Але і тут ёсць вельмі важнае добрае слова Адміністрацыі прэзідэнта. І ў гэтым сённяшнім становішчы, калі такія вось абмяркоўваем праблемы, мы не павінны гаварыць аб нейкім расколе. Я разумею, ёсць такія рэчы, калі нельга маўчаць. Але давайце дзеля будучыні не дапускаць гэтага расколу. Там дзе можна, давайце прамаўчым, там дзе можна, адмовімся ад палітыкі. Нехай палітыкі пакрычаць.

І самае апошняе. Я ведаю, калі няма грошай, гэта вельмі цяжка, вельмі дрэнна. Давайце, Генадзь Мікалаевіч, дававйце ўсе ўдзельнікі з’езду па мільёну, госці – няхай па болей. Вырашым праблему арэнды памяшкання хаця б на паўгода. Я гатоў унесці свой ўклад у гэтую справу.

З архіву VI з’езда ТБМ. Дэлегаты з’езда чытаюць “Наша слова”.

Павел Сцяцко,

доктар філалагічныхнавук, прафесар, намеснік старшыні Гарадзенскай абласной рады ТБМ імя Францішка Скарыны

“З чужой моўнай практыкі...”

Працяг

Напруга і напружанне. Акадэмічныя слоўнікі фіксуюць толькі ***напружвацца*** і ***напружанне***. Але ў жывой народнай мове, у мастацкай літаратуры выкарыстоўваецца і больш ранняя форма гэтае асновы з фінальным гукам *г*: ***напруга***. “Успамінаю з ***напругаю*** дакладнасць радкоў” (Янка Брыль. Вячэрняе. Мн.,1994.С.233). Слова занатаваў і В.Ластоўскі: “Напряжение ж. — напруга, натуга (ПРК (б).С.354).

Форма ***напруга*** – нульсуфіксавае ўтварэнне ад ***напружвацца / напружыцца***, з аднаўленнем канцавой фанемы *г*. Як і ***натуга*** ад ***натужвання / натужыцца***. Параўн. Рас. ***Напрягать (ся)*** з той самай фінальнай каранёвай фанемай *г*; або ўкраінск. ***напруга*** і ***напружений***. Слова ***напруга*** з значэннем ***“напружанне”*** ўласцівае і ўкраінскай мове.

Можна меркаваць, што слова ***напруга*** (на месцы слоўнікавага напружанне) узнікла паводле закону эканоміі моўных сродкаў, вынікам якога стала скарачэнне гукавога аблічча слова г.зн. выкарыстанне ў якасці намінацыі ўтваральнае асновы без далучэння пазітыўнага (матэрыяльна, з дапамогай гукаў) выяўленага суфікса, інакш – нульсуфіксаванае ўтварэнне; параўн: ***сумнявацца > сумнеў, спадзявацца > спадзеў, паразіць >параза, скараціць > скарот*** ды падобныя. Непасрэдным чыннікам тут магло стаць слова ***натуга*** (ад ***натужвацца/ натужыцца***), якое мае і супольныя адценні ў сваім значэнні. Мн., 1965. С.67-88).

З усяго відно, па ўсім відаць – а не па ўсяму відаць. У нашым перыядычным друку, асабліва ў 60-70-я г.г., панавала штучная сінтаксічная канструкцыя ***па ўсяму відаць.*** Гэта паўкалька з рас. ***по всему видно***. А між тым у класікаў беларускай літаратуры тут бачым сваё, адмысловае словаспалучэнне – ***з усяго відно***. Напрыклад, у Кузьмы Чорнага чытаем: “З усяго было відно, што тут будоўля дайшла да свайго завяршэння апошнімі гадамі (Збор твораў з 8 тамоў. Т. 6. Мн., 1994.С.135). І ў іншым месцы тэксту сустракаем натуральную сінтаксічную канструкцыю з прыназоўнікам ***з*** (а не ***па***, які ў беларускай мове куды менш карыстаны, чым у расейскай): “Лізавета пазнала яе (сучку) не з масці, а з усяго выгляду”. “Тлумачальны слоўнік” (Т. 1.Мн.,1977.С.488) змяшчае: “Відаць... Па ўсім відаць – “напэўна, відавочна”. Тут бачым і наступнае: “Відно ... 2.Тое, што і відаць (у 1,2 знач.). Але зварот ***з усяго відно*** ў слоўніку не фіксуецца, хоць падаецца ілюстрацыйны прыклад (з словам ***відно***) з Кузьмы Чорнага. Тое самае бачым і ў новым “Тлумачальным слоўніку” (Мн.,1996.С.112). Перакладныя слоўнікі РБС-93, БРС-62,БРС-88,89 – зусім не фіксуюць згаданых канструкцыяў. Гэта паспрыяла таму, што друк (і вуснае маўленне) запаланіла штучнае ***па ўсяму відаць (відно)***. “Русско-белорусский словарь” 1982 года (Т.1.С.92) ужо засведчыў “Весь мест. Увесь...по всему видно – па ўсім (з усяго відаць)”. Паўтораны гэты артыкул і ў РБС-93 (Т.1.С.158) і РБС –98.

Такім чынам, натуральнымі сінтаксічнымі канструкцыямі ў беларускай мове ёсць ***з усяго відаць, з усяго відно; па ўсім відаць, па ўсім відно***. Парушэнне нормы: ***па ўсяму відаць (відно).***

Навальны дождж і навальніца, праліўны дождж, заліўны дождж, залева – ці толькі лівень? У жывой, народнай, мове (напрыклад, на Зэльвеншчыне) звычайна пачуеш: “Навальны дошч як пайшоў цалуткі дзень, то пазаліваў усе агароды” (в.Грабава). Пра такі дождж яшчэ кажуць: “Дождж як з вядра або дошч як з веравок.” “Беларуска-расійскі слоўнік” М. Байкова і С.Некрашэвіча (Менск, 1926, С.110) падае: “Залева ж. – ливень. НТЗ”. Гэтае слова як тэрмін зафік-савала “Беларуская наву-ковая тэрміналогія. Выпуск 3. Геаграфічныя і касмаграфічныя тэрміны і назвы нябесных цел”. Першы акадэмічны “Русско-белорусский словарь” пад рэдакцыяй Я.Коласа, К.Крапівы, П. Глебкі (М.,1953.С234) рас. ***ливень*** перакладае наступным чынам: “Ливень м. – лівень, залева; ливнем льёт – як з вядра лье”. А вось другі акадэмічны перакладны даведнік – “Беларуска-рускі слоўнік” пад аднаасобнай рэдакцыяй К.Крапівы (м.,1962) ужо выдаляе слова ***залева*** з літаратурнага слоўніка. На с.292 чытаем: “Залева ж. Обл. см.лівень”. Гэтая недарэчнасць трапіла без усякіх зменаў і ў двухтомавае яго перавыданне (БРС – 88.Т.1.С.450). А між тым перакладныя РБС-82, РБС-93,РБС-98 не адмаўляюцца ад свайго слова. У першым томе “Русско-белорусского словаря” 1982 года чытаем: “Ливень м. – лівень, праліўны дождж, залева, ливнем льёт – як з вядра лье” (с.405). Тое самае бычым і ў перавыданнях 1993 і 1998 гадоў (Т.1.С.721). ***Залева*** – натуральнае беларускае ўтварэнне ад ***заліваць*** (***залева***, з чаргаваннем ненаціскнога ***і*** з націскным ***е (э)***; як і ў словах ***квітнець*** і ***кветка***. “Тлумачальны слоўнік” (Т.2.Мн.,1978.С.36) падае: “Залева,-ы,ж. Абл. Заліўны дождж, лівень. Пагаслі ў вірах бліскавіцы. Залева прайшла па лясах. Калачынскі. Густая залева секла мяккае лісце дрэў, хвастала парканы і дахі, змывала з тратуараў бруд і пыл. Савіцкі”. Тут правільна паказваецца, што залева – тое самае, што заліўны дождж. Менавіта ад ***заліваць*** утварыліся два словы: ***залева, заліўны***. Але чаму слова ***залева*** абласное (дыялектнае) – няведама. Відаць, таму, што яго няма ў расейскіх слоўніках, на якія арыентаваліся складальнікі беларускага тлумачальнага. Гэта асабліва пацвярджае новы “Тлумачальны слоўнік” (Мн.,1996), дзе ўжо не згадваецца слова ***залева***, а фіксуецца толькі ***лівень***, прычым з той самай дэфініцыяй, што і ў расейскіх слоўніках. Параўн.: “Лівень м. Моцны праліўны дождж” (с.318). І ў “Словаре русского языка в 4 томах” (Т.2. М.,1982. С.181): “Ливень м. Сильный проливной дождь”.

А між тым гэтае слова – ***залева*** – актыўна выкарыстоўваецца ў сучасным нацыянальным друку: “ А вось на неба не зірнула – залева як з вядра хлынула, калі апынуліся ля трыбуны... (Полымя.1998.№ 7. С.25). Набыло гэтае слова і пераноснае значэнне: “На нас абрынулася ***залева*** інфармацыі” (ЛіМ.20.02.98).

У жывой народнай мове выкарыстоўваецца побач з ***навальны дождж*** і яго аднаслоўны эквівалент ***навальніца***. А пад вечар усё пазалівала навальніца. Такі навальны дошч ліў, што свету божага ні відно, проста як вяроўкі з неба спускаліся (в.Грабава.Зэльв.р-н).

Узрывальнік, дэтанатар, запал, запальнік – а не ўзрывацель. “Адчуванне было такое, што з кожным годам небяспечны зарад расце, большае, а на круглыя даты яшчэ і асабліва хітра маскіруюцца узрывацелі, трэба добра падумаць над тым, як небяспеку зноў ператварыць у гульню”. (Алег Ждан. Час ідзе // Полымя.1998.№7.С.16).

Узрывацель... Такога слова ў бсларускай мове не фіксуе ніводны слоўнік. Тлумачальныя слоўнікі засведчылі толькі ***узрывальнік*** – “прыстасаванне ў міне, снарадзе і пад., якое выклікае выбух, узрыў” (ТСБМ. Т.5.Кн.,1.Мн.,1983.С.651). “механізм, які выклікае выбух зарада ў артылерыйскім снарадзе, ракеце, авіябомбе, тарпедзе і пад.” (ТСБЛМ. Мн.,1996. С.684).

Як бачым, аўтар (А. Ждан) перанёс у беларускі тэкст чужое, расейскамоўнае, слова. Перакладныя слоўнікі падаюць наступныя яго беларускія адпаведнікі: “Взрыватель, техн. Узрывальнік,-ка, м.” (РБС-53. С.56) “Взрыватель – узрывальнік, м.; (детонатор) дэтанатар, запал, запальнік” (РБС-82,Т.1.С.98; РБС-93.Т.1.С.170; РБС-98. Т. 1. С.170).

З значэннем “асоба, спецыяліст па ўзрывах горных пародах у беларускай мове бытуе ўтварэнн з суфіксам ***–нік***: ***узрыўнік*** (раней з гэтым значэннем фіксавалася ***ўзрыўшчык*** (-рас. ***взрывщик***).

Як бачым, дзеяслоў з тым самым коранем (аснавай) дае ў беларускай і расейскай мовах розныя ўтварэнні (назоўнікі): ***узрывальнік*** (і ***ўзрыўнік***) і рас. ***взрыватель*** (і ***взрывщик***).

Гэты пераклад яшчэ раз пацвярджае, што ўтварэнні з суфіксам ***–тель*** уласцівыя рассійскай мове, а не беларускай, дзе гэтаму словаўтваральнаму сродку найчасцей адпавядае суфікс ***–льнік*** (***врывитель – узрывальнік***).

(Працяг у наступным нумары.)

Фірмы працуюць з ТБМ

Апошнім часам можа падацца, што калі нешта робіцца ў ТБМ-е, дык гэта ў асноўным у сядзібе Таварыства. Але ж ёсць добрыя прыклады стваральнай працы і ў суполках. Нядаўна суполка Менскай фірмы "Сотвар" наладзіла для ТБМ-цаў бацькоў з дзецьмі цікавую турыстычную вандроўку на аўтобусе па замках і іншых гістарычных мясцінах Беларусі.

Турыстычная фірма "Белфер" (тэл.269-00-97) правяла гэтую вандроўку па водгуках падарожнікаў на цудоўным узроўні. Быў прадастаўлены камфартабельны аўтобус абсталяваны кандыцыянерамі і тэлевізарам з відэа.

Сябры Таварыства наведалі Мірскі замак, парэшткі замкаў у Любчы, Шчорсах, Наваградку, адпачылі на возеры Свіцязь.

Экскурсію на цудоўнай беларускай мове праводзіў супрацоўнік "Белфера" Васіль Грынь, ад якога бацькі з дзецьмі пачулі шмат цікавых фактаў, мітаў і паданняў пра мясціны па якіх падарожнічалі. Пад час вандроўкі дэманстраваліся беларускамоўныя мультфільмы "Аліса ў краіне цудаў" і фільм пра вандроўку над беларускімі замкамі на паветраным шары.

На Наваградскім замчышчы турфірма зрабіла нечаканы сюрпрыз, супрацоўнік "Бефера" граў для падарожнікаў на дудзе цудоўныя беларускія мелодыі, што ўсім вельмі спадабалася.

Дарэчы суполка ТБМ фірмы "Сотвар" акрамя вышэй згаданага здзейсніла праекты па выпуску аўдыёкасеты "Ехаў Бай" з беларускімі казкамі, калыханкамі, а таксама па перакладу на беларускую мову 3-х відэакасет з мультфільмамі вытворчасці Уолта Дэснея акторамі вядучых Менскіх тэатраў. Гэта "Аліса ў краіне цудаў", "Прыгажуня ў сонным лесе" і апошняя іх праца "Болта" – мультфільм у якім распавядаецца цікавая гісторыя, як яздавы сабака выратаваў хворых дзетак.

Гэтыя касеты можна знайсці ў сядзібе Таварыства тэл.284-85-11, а таксама атрымаць, пералічыўшы грошы звычайным паштовым пераводам на: ЗАТ "Сотвар",р/р2120000000541 у філіі № 50 ААБ "Беларусбанк" код 809. Тэл. (017)228-45-88.

Алесь Гурыновіч.

Беларускі патрыярх у сядзібе ТБМ

23 ліпеня ў сядзібе ТБМ адбылася прэс-канферэнцыя з нагоды прыезду на Беларусь яго светласці Патрыярха Сусветнага Амерыканскага Патрыярхату, Першаерарха Беларускай Аўтакефальнай Праваслаўнай Народнай Царквы на Бацькаўшчыне Юрыя (Рыжага).

Прэс-канферэнцыю распачаў старшыня Таварыства, які ў сваёй прамове падкрэсліў, што ТБМ падтрымлівае ўсе канфесіі на Беларусі і за мяжой якія карыстаюцца беларускай мовай. Таму мы рады вітаць Уладыку Юрыя, які шмат робіць каб у царкве гучала родная мова.

Пратаіерэй Іаан прабрата і паміраючай маці. Яго брат Уладзіслаў Рыжы – Рыжскі быў вядомы на захадзе царкоўным дзеячом.

Уладыка Юры у сан архіепіскапа быў узведзены ў 1978 годзе Патрыярхам Сусветнага Амерыканскага Патрыярхату Адамам (Бяляцкім).

Сёлета яго светласць Патрыярх Юры разам са святарамі БАПНЦ і прадстаўнікамі беларускай грамадскасці наведаў шэраг абшчынаў Заходняй Беларусі. Гэта прыход Святой Ефрасінні Полацкай ў пасёлку Пагранічным Беластавіцкага р-на, дзе адбылася ўрачыстая сустрэча з Патрыярхам і святая літургія з удзелам вялікай колькасці вернікаў.

У Горадні святары БАПНЦ на чале з Патрыярхам Юрыем сустрэліся з прадстаўнікамі грамадскасці горада. Адбылася цёплая гутарка ў якой ўладыка выслухаў прапановы і патрэбы прысутных, паабяцаў вырашыць пэўныя просьбы. Таксама адбыліся сустрэчы з грамадскасцю ў Слоніме і Зэльве.

Патрыярх Юры развёз па прыходах БАПНЦ святы агонь ад труны Госпада Нашага Ісуса Хрыста з Ерусаліма.

Пасля прадстаўлення пратаіерэем Іаанам перад прысутнымі выступіў і адказаў на пытанні сам Уладыка Юры. Ён у прыватнасці сказаў – кожная краіна мусіць мець сваю нацыянальную царкву, на сваёй мове. Вернікі БАПНЦ – вераць у Бога і ў сваю Бацькаўшчыну.

Прысутныя журналісты задалі пытанні Уладыку Юрыю, на якія ён адказваў.

Агенцтва Інтэрфакс:

--Ці маеце вы кантакты з рускай праваслаўнай царквой?

--Так, за мяжой адносіны вельмі добрыя, а на Беларусі, на жаль, без адказу. Пратаіерэй Іаан прапанаваў сустрэчу, але яго голас не быў пачуты.

--Колькі вернікаў?

На Беларусі 11 прыходаў, будзем падаваць дакументы для рэгістрацыі ў Менску 3-х прыходаў, але адчуваецца супрацьдзеянне.

Радыё Свабода, Нявроўскі:

– У замежжы 3-ы аўтакефальныя царквы, якія ў вас з імі адносіны?

За мяжой супольнага супрацоўніцтва няма. Сустракаліся персанальна з Мікалаем. Я расколу не хачу.

Я дайшоў да высновы, над Беларуссю навісла кара божая. Гасподзь калі хоча пакараць народ забірае розум. Нам трэба ўсім маліцца.

Невяроўскі:

--Якім чынам вы збіраецеся наладзіць кантакт з іншымі канфесіямі?

Супольнымі малітвамі. Плануюцца сустрэчы з пратэстантамі і каталікамі.

Кар."НС"

--Зараз РПЦ будуе на Беларусі шмат цэркваў у Маскоўска-Яраслаўскім стылі, калі на БАПНЦ будзе будаваць сваю царкву, як будзе выглядаць яна?

--Як у Горадні Каложа, каб 12-ць вякоў яна яшчэ стаяла.

У канцы імпрэзы Уладыка зачытаў Указ, у якім ён перадаў свае паўнамоцтвы на Беларусі пратаіерэю Іаану Спасюку.

Адбылася ўрачыстая малітва за Беларусь.

Пасля прэс-канферэнцыі Уладыка Юры разам са святарамі БАПНЦ накіраваліся на месца трагедыі на Нямізе, каб прачытаць малітву за душы загінуўшых.

У канцы імпрэзы старшыня ТБМ сп. Трусаў падзякаваў Уладыку за тое, што ён знайшоў час наведаць Таварыства і адказаць на пытанні прысутных.

Алесь Гурыновіч.

Свята беларускай культуры ў Польшчы

Дзевятнаццаць год запар у польскім горадзе Беластоку праводзіцца фестываль "Свята беларускай культуры ў Польшчы". У гэтай краіне пражываюць больш 300 тысяч беларусаў, большая частка іх - у Беластоку і яго ваколіцах. У сёлетнім фестывалі прынялі ўдзел 21 калектыў з Польшчы, самадзейныя артысты з Берасця, народныя майстры з Горадні, а таксама паэты і пісьменнікі, якія працуюць на беларускай мове, з Беластока. Арганізавала фестываль польскае "Беларускае грамадска-культурнае таварыства".

На здымках:

1. Сябар Саюза пісьменнікаў Беларусі і Польшчы вядомы літаратар з Беластоку Васіль Петрачук.
2. Адна з удзельніц фестывалю, сябар "Беларускага грамадска-культурнага таварыства" Эмілія Туроўская з Беластока.

Фота Мікалая Пятрова, БелТА.



Запрашаем вучыцца ў Вільню

Другі год факультэт славістыкі адной з самых прэстыжных ВНУ Літвы Віленскага педагагічнага універсітэта дае жыхарам Беларусі і іншых краін ўнікальную магчымасць атрымаць вышэйшую алукацыю па спецыяльнасці беларуская філалогія. Акрамя гэтай спецыяльнасці, студэнты змогуць выбраць дадаткова яшчэ адну: руская філалогія, польская філалогія, журналістыка, мсстодыка пачатковага навучання, гісторыя культуры.

Навучанне платнае. Тэрмін навучання: дзённае 4г., завочнае – 5г.

Набор будзе ажыццяўляцца без уступных экзаменаў па выніках конкурсу атэстатаў. Дакументы - атэстат (копію) альбо дыплом вышэйшай школы, медыцынскую даведку, 3 фотакарткі (3х4), выпіску з працоўнай кніжкі (калі ёсць), заяву на імя рэктара - можна выслаць на адрас:

Baltarusiu filologijos katedra
Vilniaus pedagoginis universitetas
Studentu 39-527
2024 Vilnius
LITHUANIA

На тэрыторыі Беларусі дыплом Віленскага педагагічнага універсітэта мае юрыдычную сілу.

Пад час вучобы студэнты змогуць атрымаць льготныя візы, папрацаваць у багатых архівах і бібліятэках Літвы, пазнаёміцца з мовай і культурай народа-суседа, прыняць удзел у культурным жыцці беларускай дыяспары. Можа будзе таксама паспрабаваць свае сілы ў беларускіх праграмах беларускага радыё і тэлебачання, газетах Літвы. Урэшце – паблукаць па старажытнай Вільні і палюбавацца на славутыя цэрквы і касцёлы, спазнаць яе беларускія старонкі, а значыць, і ўласную культуру і гісторыю. А галоўнае – паслухаць лекцыі вядучых навукоўцаў-гуманітарыяў, сустрэцца з вядомымі культурнымі дзеячамі Літвы, Беларусі і замежжа.

Па больш падрабязную інфармацыю запрашаем звярнуцца па тэлефонах:

У Баранавічах – (8 – 1634) 70503, 71378;
У Вільні – (8 – 10- 370 - 2) – 725801, 731841.

Лілея Плыгаўка,
Заг.кафедры беларускай філалогіі ВПУ.

№ 30(415) 28 ЛІПЕНЯ 1999 г. Наша СЛОВА

Як русіфікавалі Афганістан

"Навука расейскай мовы - гэта справа паважная. Вучань, які ведае яе, будзе здольны прачытаць карысныя матэрыялы па расейску. Моладзь наблізіца, дзякуючы гэтаму, да брацкага нам Савецкага Саюза", - заклікаў у 1980 годзе Першы кангрэс настаўнікаў Афганістана, які быў скліканы праз два гады пасля камуністычнага перавароту.

Перад красавіком 1978 года ў Афганістане было каля 50 моў, якімі карысталася блізка сямі мільёнаў народаў розных лінгвістычных групаў. Афіцыяльнай мовай была мова пушту, на якой гаварылі плямёны пушту, што кіравалі на працягу 18 стагоддзяў . Разам з ёй распаўсюджана была, мова дары, што мае дзвюхтысячагадовую гісторыю і якую вучоныя адносяць да мадыфікацыі персідскіх. Пушту не дамінавала над дары ані па колькасці тых, хто гаворыць і піша, ані фармальна. Аднак, сталася так, што яна стала мовай кіраўнічых этнічна-племянных эліт, мовай вайсковых камандаў і афіцыйных дакументаў. Прадстаўнікі меншых народаў, у сваю чаргу, вучыліся пісаць і чытаць на дары, бо лічылі гэтую мову больш універсальнай і багатай. Некаторыя прыраўноўвалі мову пушту да рыкання асла.

Забракаваная мова

Калі масквоўскія эліты вырашылі захапіць Афганістан, яны добра ведалі аб антаганізмах паміж уладарамі краіны - народам пушту і рэштай шматмільённай дзяржавы - таджыкамі, узбекамі, хазарамі, туркменамі, нурыстанцамі і шматлікімі іншымі. Забіўшы рукамі замахоўцаў прэзідэнта, які адначасова быў пуштунскім князем, Мухаммада Дауда, Крэмль не адразу пачаў праводзіць антыпуштунскую палітыку. Першым марыянетачным прэзідэнтам Дэмакратычнай Рэспублікі Афганістан стаў адзін з прадстаўнікоў пушту - Нур Мухаммад Таракі. Наступны - забойца Таракі - Хафізула Амін - таксама быў з пушту. Калі і гэты згінуў ад куляў савецкіх ахоўнікаў, яго крэсла заняў прэзідэнт Бабрак Кармаль які аказаўся настаўленым супраць пушту. Яго маці была таджычкай. Пачалося паступовае знішчэнне мовы пушту. Бабрак ніколі не размаўляў на пушту, таксама як і Наджыбула, які змяніў Кармаля і дачакаўся адыходу расейцаў.

Гульня на этнічных пачуццях

Афганскія камуністы, падобна як і іх расейскія падтрымоўцы абвясцілі поўную роўнасць усіх этнічных групаў Афганістана, але выразна вылучалі тых, хто гаварыў на мове „дары". На самой справе, аднак, як можна прачытаць у апублікаванай у Англіі працы іраністкі Яўгеніі Пструсінскай, мэты моўнай палітыкі Крамля былі значна больш далёкімі, чым гэта выглядала на першы позірк. У школьных праграмах была разбудавана канцэпцыя вывучэння лакальных моваў, што дапамагала разбіваць лінгвістычна і да гэтага часу падзеленую шматэтнічную краіну. Напрыклад, ствараліся зусім новыя мовы, для якіх выпрацоўваўся новы алфавіт. Ужо не толькі пушту страціла права лічыцца надэтнічнай мовай, але і дары была зраўняная з іншымі мовамі. Плануючы дэзінтэграцыю Дэмакратычнай Рэспублікі Афганістан, разлічвалася на стварэнне лінгвістычнай супольнасці, якая магла б аб'яднаць таджыкаў, узбекаў і туркменаў, якія жывуць на поўнач ад Гіндукушу з народамі савецкіх рэспублік з-за Аму-Дар'і. Падтымлівалася „наднацыянальная інтэграцыя" багатага, напоўненага прыродным газам паўночнага Афганістана з савецкім Узбекістанам і Таджыкістанам. Адначасова абмяжоўваліся кантакты паміж афганскімі і „савецкімі" узбекамі, якія маглі б разам узгадваць калішнюю легендарную мінуўшчыну. Была, нават, уведзена цэнзура на гаворкі плямён, якія жылі каля Паміра ў г.зв. Ваханскім Калідоры.

„Цывілізаванне" азіятаў праз расейскую мову

У гэтым запланаваным моўным моры, адзінай мовай, якая магла б аб'яднаваць „цывлізаваных" праз Маскву азіятаў павінна была стаць расейская (па савецкаму ўзору ў Сярэдняй Азіі). Гэтаму дапамагалі і друкаваныя вялікімі накладамі ў СССР рознага тыпу падручнікі, слоўнікі і дапаможная літаратура для вывучэння расейскай мовы, каб падпарадкаваць сабе азіяцкія народы. Можна было павышаць кваліфікацыю на курсах расейскай мовы, што пазней дапамагала рабіць кар'еру. Ужо праз некалькі месяцаў пасля дзяржаўнага перавароту камуністы ў Кабуле атрымалі 50 савецкіх фільмаў. Рэкламай расейскай мовы займалася не толькі тэлебачанне і радыё. У міністэрствах былі створаны „дамы дружбы", у цэнтры сталіцы адчынен „Дом савецкай кнігі" а таксама выдаваліся шматлікія стыпендыі на навучанне ў Краіне Саветаў. Афганскіх дзяцей вывозілі на час у савецкія школы ў сярэднеазіяцкія рэспублікі. Адначасова да мінімуму была абмежавана навука іншым замежным мовам.

Гэтыя немалыя і каштоўныя намаганні павінны былі дапамагчы раззброіць этнічна жыхароў Афганістана. Русіфікацыя праводзілася адначасова з маніпуляцыямі. Напрыклад з геаграфічных мапаў знікалі нявыгадныя для ўладаў факты. Былі перароблены цэлыя групы гістарычных мапаў, на якіх не засталося інфармацый аб культурных традыцыях краіны. Не магчыма было знайсці звесткі пра геалагічныя дадзеныя, бо прыродныя багацці былі для савецкіх інтарэсаў найважнейшымі. З атласаў былі выкінуты цэлыя народы, а ў некаторых выпадках іх гістарычна аднеслі да суседніх краінаў. На самой справе, не было і мовы, каб паказаць сапраўднае становішча рэчаў, бо неабходна было апраўдаць палітыку дэпартацыяў і прымусіць да страты нацыянальнай свядомасці. Лічыцца, што каля 20 прац. насельніцтва, якое гаварыла на мове пушту было забіта або выгнана ў Пакістан.

Савецкія войскі пакінулі пасля сябе мора руінаў, труны і нязлічаную колькасць замінаваных палёў, на якіх і зараз гінуць афганскія вяскоўцы. Хаос ваенны, гаспадарчы і моўны будзе цягнуцца яшчэ доўга. Пасля амбітных праектаў русіфікацыі Афганістана засталіся мізэрныя сляды. Адзін з іх - слова „приказ", якое усё яшчэ выкарыстоўваецца.

Падрыхтавана
Аленай Стралковай
паводле артыкула Лешака Дзенгеля „Як русіфікавалі Афганістан" („Tygodnik AWS")

На якой мове гаворым?

Калі я прысутнічаў на сумесным пасяджэнні сяброў раённага таварыства беларускай мовы імя Ф. Скарыны і чытачоў цэнтральнай бібліятэкі Шклоўскага раёна, то прыгадаў дыялог, які пачуў выпадкова з купкі дзяўчынак (прыкладна васьмікласніц) у гарадскім парку:

-Я даже не знаю, як яго завуць.

-А чаго не спыталася?

-Неяк стыдна было.

Справа ў тым, што першы выступовец на пасяджэнні старшыня таварыства, выкладчык Шклоўскага ПТВ-139 Аляксандр Грудзіна звярнуўся з лейтматыўным пытаннем перад выступам: "На якой мове гаворым мы – жыхары Шклоўшчыны?" Агульнымі намаганнямі прыйшлі да высновы, што гэта і не расейская, і не беларуская мова, а наш, мясцовы дыялект з прымессю русізмаў. Інакш такую гаворку называюць "трасянкай". Менавіта гэта нацвярджае і прыведзены вышэй дыялог школьніц.

Вядома, прызначэнне раённага таварыства беларускай мовы імя Ф. Скарыны – гэта захаванне і прапаганда беларускай мовы. Таму і гаворка вялася ў адпаведным кірунку. Так, дырэктар РВА ЖКГ Рыгор Костусеў расказаў пра тое, як ён ставіцца да беларускай мовы ў сваім жыцці, адкуль зачаліся парасткі паважлівых адносінаў да матчынага слова.

Нязмушана ўдзельнікі паседжання ад сучаснасці апынуліся ў сівой даўніне. Прыгадвалі падобныя сітуацыі, якія мелі месца ў лёсе моў іншых народаў.

Так, у часы Ягайлы і Ягайлавічаў (1386-1572) і нават пазней – да канца 17 ст. польская мова ў самой Польшчы была мовай вясковага насельніцтва і дробнай шляхты, адным словам, " мужыцкай" мовай. Вышэйшыя ж слаі польскага насельніцтва карысталіся лацінай, а ў гарадах – нямецкай мовай.

Першым падаў голас за ўвядзенне ў пісьменнасць польскай мовы рэктар Кракаўскага універсітэта Якуб з Журавіцы. У яго працы аб упарпадкаванні польскай графікі і правапісу сцвярджалася, што разумна робяць народы, пішучы сваю гісторыю на роднай мове.

Следам за ім выказаўся за польскую мову ў Польшчы каля 1475 года Астрарог. Ён дамагаецца, каб казанні для польскіх вернікаў гаварыліся не па-нямецку, а па-польску. Важную ролю ў замене лаціны на польскую мову ў каталіцкім Касцёле сыграла польская шляхта ў сваёй барацьбе за шляхецкую дэмакратызацыю правоў у дзяржаве. Пераломным стаў 1543 год, калі Жыгімонт Стары выдаў распараджэнне, каб запісы, позвы і прысуды пісаліся па-польску ў Польшчы.

Тым часам, будучы дзяржаўнай мовай Вялікага княства Літоўскага, беларуская мова не мела такога гаротнага існавання, якое яна перажывае цяпер.

Удзельнікі пасяджэння прыйшлі да высновы, што пры станаўленні (тое ж самае – пры аднаўленні) той або іншай мовы ніхто ў народа не пытаўся. Палітыку ў гэтым кірунку рабілі прадстаўнікі высокаадукаванага асяродку, патрыёты-нацыяналісты, сыны Радзімы.

Дырэктар бібліятэчнай сістэмы раёна Валянціна Шаўкавая гаварыла пра навінкі беларускай літаратуры і перыядычнага друку па абмяркоўванаму пытанню. Сярод іх назвала кнігу Яўгена Анішчанкі "Беларусь у часы Кацярыны II". Часам у выданні апісваюцца падзеі таго перыяду і са Шклоўшчыны вядомыя ўжо і невядомыя факты, якія мелі месца пасля першага раздзелу (1772) Рэчы Паспалітай. У выніку яго Шклоў адышоў ва ўладанне Расейскай імперыі. У цэлым жа царскі ўрад дзейнічаў на далучаных землях больш, як кансерватар, чым рэфарматар і пераўтваральнік. Такую выснову робіць аўтар кнігі.

На пасяджанні гучала цудоўная музыка пад кіраўніцтвам выкладчыцы раённай школы мастацтваў Алы Сяднёвай. Асабліва былі заварожаны прысутныя папулярным паланезам Міхала Агінскага ля-мінор "Развітанне з Радзімай". Усяго кампазітар напісаў для фартэп'яна каля 20 паланезаў. А названы твор стаў сусветна вядомым.

Л. Анціпенка. Член Саюза журналістаў Рэспублікі Беларусь. Горад Шклоў.

ФІЛАЛАГІЧНЫ ТУПІК, АБО БЕЛАРУСКІЯ РУСКІЯ...

Не гэтак даўно прачытаў у газеце: "Заява беларускіх курдаў".

... Беларускія курды, беларускія габрэі, беларускія татары, беларускія палякі, беларускія літоўцы, беларускія грузіны, беларускія армяне, беларускія цыгане, беларускія казахі, беларускія малдаване, беларускія эстонцы, беларускія латышы, беларускія балгары, беларускія немцы, беларускія негры, беларускія эфіопцы, беларускія казакі.

Усяго паводле статыстычных звестак на Беларусі жыве каля 120 прадстаўнікоў розных народаў. Шмат якіх я згадаў у сваім пераліку. Але не ўсіх. А вось каго? Не згадаў я рускіх на Беларусі. А чаму? Ды з аднае адной простае прычыны – не ведаю, як гэта напісаць, як запісаць. Як не кручу, як не тужуся, як не мяркую – выходзіць якоесь недарэчча. Глядзіце: беларускія рускія!

Якоесь філалагічнае масла масленае, якоесь адно непаразуменне: беларускія рускія! Неяк розумам не ахапіць такое спалучэнне. А чаму? Што тут адно аднаму замінае? Адкуль ідзе гэтая нестыкоўка, гэтая супрацьлегласць? Ды два прыметнікі, стаўшы побач, пабіваюць адзін аднаго, ствараюць бессэнсоўніцу. А іншага назову расейская нацыя не мае. То як тады пазначыць, што на Беларусі жыве паўтара мільёна беларускіх рускіх? Калі напішу ці скажу: " На Беларусі жыве паўтара мільёна рускіх", ды гэта зусім не тое, што я хацеў сказаць. А я хацеў, хачу сказаць, што гэтыя рускія беларускія. Ды нешта гэта няўклюдна гучыць. А яно і напраўду: нашы беларускія рускія не зусім тыя рускія, што ў Расеі жывуць. Беларускія рускія яны ўжо трохі і беларусы.

Некаторыя з іх і нашу мову з большага ведаюць, разумеюць. І з літаратурай нашай знаёмыя, і з гісторыяй, і служаць Беларусі, як і прадстаўнікі іншых народаў. Усё гэта натуральна. Усё так і павінна быць. Толькі вось адна нязручнасць: нямаведама, як моўна пазначыць, што гэтыя рускія належаць Беларусі. Хацелася гэтую прыналежнасць укласці ў звыклую моўную мадэль кшталтам беларускія казакі, беларускія чачэнцы, беларускія ўкраінцы... Ды не выходзіць. Мо хто з чытачоў "Нашага слова" падкажа выйсце з гэтага філалагічнага тупіка і патлумачыць прычыну такой філалагічнай таўталогіі? А можа нам карыстацца наваўтварэннем "расіяне" – "беларускія расіяне". Але ж назоў "расіяне" больш шырокі, чым рускі. Расіяне – гэта ўсе жыхары ўсёй шматнацыянальнай Расіі. А мы маем патрэбу акрэсліць менавіта толькі рускіх, якія жывуць на Беларусі, належаць Беларусі. То наўрат ці назоў "расіяне" у згаданым выпадку падыходзіць. Не падыходзіць назоў "расіяне". То як тады нам падкрэсліваць, што гэтыя рускія беларускія?

Ул.Содаль.

Размова па сутнасці

Добра было б, каб хто небудзь даў ацэнку прарасейскай радыёперадачы "Разговор по существу". Якія ж мэты яна пераследуе? Я лічу, што гэтая антыбеларуская перадача, дзе бэсціцца ўсё беларускае і лепшыя людзі Беларусі, нацэлена на скалечаны марксізмам – ленінізмам беларускі народ, каб "даказаць" гэтаму народу, што ён не мае сваёй нацыянальнай мовы, культуры, гісторыі, што ён заўсёды быў і назаўсёды павінен быць толькі расейскай рабсілай, паслухмяным расейскім парабкам і пад "вадзіцельствам" сваіх цівуноў--адданых расейскіх халуёў – верна служыць свайму "старэйшаму брату".

Старэйшыя браты-расейцы пастаянна клапоцяцца аб сваіх малодшых братах – беларусах, дазваляюць ім вучыцца чытаць і пісаць па расейску, а тых, хто страціў нацыянальную свядомасць і чалавечую годнасць і нездольныя вырашаць самастойна свой лёс і лёс сваёй Бацькаўшчыны, а просяць пакарання лепшых людзей Беларусі (С.Шушкевіча, М.Грыба, З.Пазняка, С.Шарэцкага і другіх) за тое, што гэтыя людзі змагаюцца за незалежную суверэнную Беларусь супраць закабалення беларускага народа Расеяй, такіх зомбі і манкуртаў Расея не будзе вывозіць на Калыму ці Таймыр, каб там не загінулі ад холаду і голаду лепшыя расейскія парабкі, а дасць ім магчымасць праявіць любоў да старэйшых братоў гераічнай працай дзе небудзь на Цюменскіх нафтавых промыслах.

Характэрным для прарасейскай перадачы "Разговор па существу" з'яўляецца тое, што вядучыя і большасць яе ўдзельнікаў гэта людзі невысокага адукацыйнага і культурнага ўзроўню зацыкленыя на "Саюзе нерушимом", зашораныя бальшавізмам, са стэрэатыпным мысленнем, з антынавуковым марксісцка-ленінскім светапоглядам.

Такія людзі не могуць рэальна і аб'ектыўна ацаніць сучаснае міжнароднае становішча. Іх "разгавор" звычайна зводзіцца да аднаго - ва ўсіх няшчасцях і бедах вінаваты ні хто іншы, як гэтыя праклятыя амерыканскія імперыялісты-капіталісты.

Чаго гэтыя амерыканцы перашкаджаюць Слабадану Мілошавічу "лучшему другу" Лукашэнкі, знішчаць і выганяць са сваіх дамоў косаўскіх албанцаў. Яны ж "падбухторваюць" і беларускую апазіцыю, каб перашкаджала Лукашэнку заганяць беларусаў у расейскі рай, "чтобы не стали придатком Запада", а былі вечнымі рабамі Ўсходу. Лукашэнка "ганарыцца" працалюбівым беларускім народам і ўпэўнены, што калі яго ўмела прыціснуць, то кожны беларус зможа пракарміць 15 расейцаў, абы толькі была сталінская дысцыпліна і забарона на адраджэнне беларускасці ды не развалілася "Славянское единство".

Пастаянна "даказваць", што беларускі народ самастойна не зможа жыць, бо няздольны сам вырашаць свой лёс без моцнага бальшавіцкага бізуна. І каб дэмакрат-гуманіст Міхаіл Гарбачоў не паламаў бальшавіцкі бізун, то мы ўжо жылі б пры камунізме.

Брыдчэйшай перадачы, як "Разговор по существу" напэўна, нідзе не было і ніколі не будзе, нават у самой адсталай краіне, дзе ёсць народ, які паважае сябе і сваю Радзіму.

Удзельнікі "разговора" плачуць па нашых суседзях - балтах, якія жывуць горш за нас, бо не захацелі быць вечнымі расейскімі парабкамі, імкнуцца ў Еўропу і нават хочуць уступіць у НАТА, каб не баяцца акупацыі з Усходу. Яны перажываюць і за ўкраінцаў, якія паварочваюцца задам да "славянского единства" і глядзяць з надзеяй на цывілізаваны Захад, каб жыць, як нармальныя людзі.

Заклікаюць "создать большое сильное, мощное государство", славянскі Саюз, пры ўмове, што расейскія каланізатары не адмовяцца прыняць у Расейскую імперыю беларускіх мільянераў на правах сваіх парабкаў і перасяліць у Саюз сербаў-разбойнікаў начале з "лучшим другом" Лукашэнкі – ваенным злачынцам Слабаданам Мілошавічам. "Не быць Саюзу, не быць нам",- запалохваюць беларускі народ "разговорники", бо амерыканцы адразу загоняць нас у Еўропу і чаго яшчэ добрага прымусяць нас "людзьмі звацца", што беларусам не пад сілу.

ЧаславХвайніцкі,
г. Смаргонь

"Добра там, дзе нас няма"

"Бальшавізм – гэта не палітыка, гэта хвароба". (Уінстан Чарчыль).

Паэт пісаў пра сваё каханне: "Мама, твой сын цудоўна хворы".

Хваробу бальшавізму цудоўнай не назавеш. А да думак пра бальшавізм падштурхнулі размовы і артыкулы ў летувіскай прэсе пра "райскае жыццё" ў суседняй Беларусі, якая працягвае бальшавіцкі шлях, быццам бы.

"У Летуве размовы пра жыццё ў Беларусі" – адны другіх супрацьлеглей. Верыць афіцыйнай прапагандзе? Шчыра кажучы, не заўсёды хочацца. Апазіцыйнай? Таксама не без перагінаў. Лепш самому пабываць там, сапраўды, кажучы – лепш адзін раз убачыць, чым сто — пачуць", — так пачынае артыкул летувіскі жураліст афіцыйнай дзяржаўнай газеты "Эхо Литвы" Альгердас Плукіс "Белорусы - хозяева своей державы", Вильнюс Новополоцк - Полоцк – Витебск - Вильнюс № 85 от 5 мая 1999 года. А то летувісы, альбо палякі не гаспадары сваёй дзяржавы. Пачытае такія нататкі мясцовы летувіс, ці расеец далёкія ад сапраўднага жыцця ў Беларусі і, сапраўды, проста рай. А для мяне, напрыклад, як і для многіх, хто перасякае мяжу ў пункце Лаварышкі, пра які піша А.Плукіс, як гром сярод яснага неба. Дарэчы, Летува ганарыцца, — устанаўліваецца бязвізавы рэжым з многімі краінамі Заходняй Еўропы і далёкага замежжа, а з суседнімі з кожным днём больш шчыльна "замыкаецца". Неяк у інтэвію прэзідэнт В. Адамкус сказаў: "Мы маем моцнага, але міралюбівага суседа – Беларусь". Тады навошта ж так адмяжоўваецца? А таму што суседзі працягваюць ісці бальшавіцкім шляхам. У Летуве, у калуарах, Беларусь называюць "камуністычным запаведнікам". А пакуль беларускім школьнікам недасягальная " Пагоня М. Багдановіча, дворыкі Фр.Скарыны, як і для вернікаў Вострая Брама".

А вось для журналіста фармальнасці на прапускным пункце Летувы Лаварышкі і Беларусі - Катлоўка занялі лічаныя хвіліны.

Чытаем далей – "кідаюцца ў вочы паабапал дарогі апрацаваныя і засеяныя палі. І першая сустрэча ў вёсцы Варона, што ў 25 кіламетрах ад мяжы. Заглянулі ў госці да ветарынарнага доктара, жыве добра, моцная сядзіба, дачка – студэнтка, сын - школьнік, суседзі працуюць на мытні. Але чамусці журналісту "не кінуўся" ў вочы ў цэнтры вёскі паўразбураны Георгіеўскі касцёл помнік 18 стагоддзя, які відаць здалёку, вакол якога стаіць сельскагаспадарчая тэхніка. Па цэнтральнай дарозе Вільня Віцебск размешчаны цэнтры калгасаў і саўгасаў. А звярнуць убок ад Міхалішак, у вёсках Яцыны, Пугавічы, ужо чатыры гады зусім не ўзорваюцца палі. Ёсць і такія. У кожнай цэнтральнай сядзібе –Чапаеў, у Вароне – К.Маркс, у Варыянах - Ленін, "махаюць" у светлае будучае, чаго даўно няма ў Летуве, праўда, пра гэта ні гу-гу. Далей піша пра нізкія цэны ў Беларусі, напрыклад, бензін у тры разы танейшы, чым у Летуве, зноў жа не параўноўвае заробкі і пенсіі. А вось пра вясковых беларускіх пенсіянераў піша, што ім калгасы дапамагаюць не толькі кармамі, а і харчамі. І сапраўды, жыві і радуйся. Ва ўсіх калгасах цалкам падтрымка прэзідэнта. Ва ўсіх ёсць праца і гарантаваныя заробкі. І не " нуждаются" в западных буржуев помощи", якія сваёй "бескорыстной братской капиталистической помощью" паставілі на кадені Расею і зрабілі з народа жабракоў. Такой ім хочацца бачыць і Беларусь. Забылі, што самі пабывалі там, куды Макар цялят не ганяў. "Каб была эканамічна і ваенна магутная Расея, патаўцы не пасмелі б бамбіць Югаславію", — разважае кіраўнік наваполацкай фірмы па вытворчасці пылесосаў Г. Фекцістовіч. Далей апісаны цудоўны, чысты, прыгожы горад Наваполацк, дзе "беспрацоўных практычна няма (цытую дакладна), дзе поўныя крамы, развіта прамысловасць, мізэрная квартплата. Сям'я з шасці чалавек жыве ў дастатку. (Жонка - Наташа бухгалтар, бабуля пенсіянерка, пенсія 5 мільёнаў). Трое дзяцей. Адна дачка - студэнтка, другая – яшчэ ў садку, сын - Косця - школьнік. Грошай на ўсё хапае." Трэба ж было выкапаць такую сям'ю. Ніхто не распавёў пра знакаміты ўказ дырэктара Наваполацкага нафтапрадпрыемства пра забарону весці на беларускай мове справаводства. Уявіць такое ў Летуве. Усё ўбачанае праз "ружовыя акуляры".

"Прамысловасць не разбурана ў Беларусі, яна з кожным днём мацнее. Усе падтрымліваюць прэзідэнта. А пра апазіцыю думаюць так, што гэта не дарваўшыеся да ўлады палітыкі". А ў Летуве кожны дзень пішуць пра вялікую запазычанасць Беларусі Літве за электраэнергію.

Далей пішацца пра Беларусь, якая, "як індустрыйная дзяржава займае адно з вядучых месц на ўсходнім рынку, выпускае каля 95 адсоткаў мікрасхем і электронных кампанентаў на тэрыторыі СНД, каля 70 адсоткаў трактароў, 60--машын, 70 – тэлевізараў і радыёапаратуры. Экспартуе прадукты харчавання, дапамагае выжыць суседнім абласцям Расеі."

"Вось такія, яны нашы суседзі!" – заканчвае свой артыкул Альгірдас Плукіс. Ну проста рай, ні ў якое параўнанне з беспрацоўнай Летувой, з зліквідаванымі калгасамі.

Дарэчы пра такое ж жыццё беларусаў пішаі Ю.Строганаў у "Літоўскім кур'еры". Да ведама – гэтыя газеты "чуць бальшавіцкія", якія любяць беларускага прэзідэнта, чуць чырвоныя.

Такую інфармацыю падаюць і беларускія СМІ. А ўсё гэта таму, што мэта палітыкантаў паслязаўтрашні рай, а не сённяшняе паляпшэнне, якое толькі і можа палепшыць жыццё. І метады дасягнення мэты важнейшыя, чым мэта, усероўна яе ніколі не дасягнуць, калі не лічыцца з сродкамі. Таму і ўзнікае думка "А ці не заказныя ўпамянутыя артыкулы?". Ёсць, дарэчы, пагаворка: "Добра там, дзе нас няма".

Левакадзія Мілаш,
Вільня.

Анатоль ВЯРЦІНСКІ

ТЫ ЖЫВЕШ, БЕЛАРУСЬ?

Размова з Радзімай

Прагучаў тройчы вокліч,
што Радзіма жыве.
Прагучала малітва "Магутны Божа".
Пайшло рэха і сціхла.
А ў маёй галаве
усё тое ж пытанне б'ецца трывожна...
Ты жывеш, Беларусь?
Беларусь, ты жывеш?
Беларусь, я не маю на ўвазе, канешне,
што не сееш, не жнеш,
хлеб зусім не жуеш.
Беларусь, я пытаю пра іншае нешта.
Што ў цябе на душы?
Што ў цябе за душой?
Што наогул з тваёю душой?
Ці ты, можа, ужо за тою мяжой,
дзе сама сабе стала чужой?
Што з душою тваёй?
Знежывела зусім?
Ці яе яшчэ нешта жывіць і грэе?
Я гляджу ў твае вочы -
дзе вачэй тваіх сінь?
Твае вера, любоў і надзея?
Я гляджу ў твае вочы
мала радасці ў іх.
У вачах тваіх –
скруха, страх ды пакора.
Ды яшчэ, як сказаў
хтось з прарокаў тваіх,
"Беларусі мужыцкай адвечнае гора".
Я гляджу ў твае вочы -
што ў іх: тло ці святло.
Над табой зноў панус
сіла чужая.
Ты жывеш, Беларусь?
Ці табе ўсё адно,
як твой шлях вызначаюць,
хто твой лёс вырашае?
Ты жывеш, Беларусь?
Мы, твая кроў і плоць,
траекроць зноў на плошчы пракрычалі,
што жыве Беларусь,
пракрычалі шматкроць
хто ў надзеі,
хто ў гневе,
хто ў адчаі.
І ў тым хоры звінеў,
як вясновы капеж,
голас чысты, празрысты, юначы.
Значыць , ты, Беларусь, не змярцвела, жывеш!
Не гучаў бы той голас іначай!..

ЖЫВЫ ГОЛАС

Але найбольш запаў у душу яе адказ на пытанне пра рэабілітацыю: "Не падавала і падаваць не буду я сябе вінаватай перад Радзімай не лічу. Прасіць аб рэабілітацыі прызнаць сваю віну".

(З гутаркі Людмілы Майсені з былой палітзняволенай Надзеяй Дземідовіч.)

Вось гэта голас!
Вось гэта і слова, і дзея!
Нізкі паклон Вам, цётка Надзея.
Нізкі паклон Вам, спадарыня Дземідовіч.
Нагледзеліся Вы
Столькі жахлівых відовішч.
Наслухаліся Вы
Столькі слоў паганых.
Зведалі столькі пакут...
Душа Ваша ўся ў ранах.
Душа Ваша ў ранах уся,
але яна ўсё ж жывая.
Бывае, нясцерпна баліць,
баліць, але годна трывае.
Вынесла ўсё яна
здзекі, этапы, краты.
Не дасягнулі свайго,
шматлікія Вашы каты.
Не вынішчылі ніяк
яны беларускасці Вашай.
Яна, як Божы знак,
давала Вам моц і бясстрашша.
Не змусілі каты Вас
скрыцца, стаць на калені.
Вышэйшыя суддзі для Вас
Радзіма і сумленне.
Ды яшчэ матчын наказ
крыху грэў Вашы грудзі:
"Надзейка, не плач. Век так не будзе!"

Дзень добры, рэдакцыя "Нашага слова"!

Піша вам студэнтка I курса факультэта беларускай філалогіі і культуры БДПУ імя М.Танка Чумічова Вольга. Пішу ўпершыню, але газету чытала ўжо даўно, класе ў 9-ым, калі асабліва цікавілася палітыкай і сучасным станам беларускасці. Зараз выпісваю "Наша слова". Я не ведаю, ці шмат да вас прыходзіць негатыўных лістоў з асуджэннямі ад усялякіх там беларусафобаў і вялікароскіх шавіністаў... напэўна. І я ні ў якім разе не хачу далучаца да іх, але, калі дазволіце, выкажу сякія-такія меркаванні наконт вашае газеты і руху за беларускае ўвогуле. Па-першае вашая газета прадстаўляе ТБМ, дык чаму ж у ёй столькі "апячатак"? Яшчэ магу зразумець знакі прыпынку, якія разрываюць словы пасярод радка, — бывае, сама ведаю, што такое працаваць з кампутарам. Але ж для гэтага існуе карэктар. А што датычыць іншых апячатак – як павінна я рэагаваць на пафасны заклік: "Жыве беларуская мова!"? І гэта не адзінкавы выпадак. Нават я, без адукацыі дзяўчына, заўважаю безліч такіх ляпаў, а што ж людзі з вышэйшай, а можа і не адной, адукацыяй, якія чытаюць "Наша слова"? Я лічу, што вельмі важна звярнуць увагу на гэты недахоп: вы ж самі змагаецеся за чысціню нашае мовы!

А што датычыць барацьбы за беларускую мову, я лічу, што не трэба вяртаць мяккі знак і ўсё іншае, што было да 1933 года. Можа, тады вернем старабеларускае пісьмо? Хаця, канешне, я згодна, што ўплыў арфаграфіі настолькі сапсаваў наша вымаўленне, што нават настаўнікі гавораць "на дошцы" і г.д. А ўжо калі я скажу "нясвіскі", "Астроскі" ці "нарэс'це", наогул людзі падумаюць, што ў мяне з дыкцыяй праблема. Але гэта ўжо хібы нашай адукацыі, а не рэформы 1933 г. Наступнае. На мой погляд, чым "дзяліцца сваёй заклапочанасцю з нагоды стану беларускай мовы", "праводзіць пікеты" і выкрыкваць гучныя лозунгі тыпу "Жыве Беларусь" і г.д., трэба змяняць здаецца безнадзейную сітуацыю вакол сябе. Так, пакуль што я не заўсёды размаўляю на беларускай мове, бо не знаходжу падтрымкі сярод сваіх аднакурснікаў (спецыяльнасць у мяне – англ.мова і бел.мова і літ-ра, таму большасць паступілі сюды дзеля замежнай), але я ведаю, што ў хуткім часе пераадолею гэты бар'ер. І я не хаджу з лозунгамі – я проста вучуся, каб стаць настаўніцай мовы і літаратуры, каб несці дзецям, не толькі веды, але і любоў да нашай Радзімы, яе культуры. І калі паралель маіх вучняў будзе любіць і паважаць Беларусь, валодаць сваёй мовай, ці не дасягну я большага, чым падлеткі з маладога фронту, якія крычаць: "Далоў Лукашэнку", а дома слухаюць "Нірвану"? Даруйце, калі я была катэгарычнаю ў сваіх поглядах, але гэта юнацтва. Поспехаў вам. І яшчэ. Калі б вядомыя дзеячы культуры Беларусі прыходзілі ў навучальныя ўстановы і агітавалі размаўляць на беларускай мове (хаця б у нас, у БДПУ), мне здаецца, гэта дало б плён.

З павагай,

Чумічова Вольга.

Добры дзень, паважаная рэдакцыя!

Піша Вам вучань 10-га класа СШ № 2 г. Дзятлава. Падставай для напісання ліста сталася дасланне подпісаў за адкрыццё беларускамоўнай ВНУ, але акрамя гэтага ў мяне ёсць да вас шэраг прапаноў.

1. На асабістым прыкладзе я ведаю, што ваша газета губляе шмат падпісчыкаў, якія выпісалі б яе з задавальненнем, але не падазраюць аб існаванні такога выдання. Першы раз пра "Наша слова" я пачуў па тэлевізары ў праграме "Роднае слова", дзе гаварылася аб аднаўленні газеты, але не выпісваў, таму што сумняваўся аб распаўсюджванні па падпісцы. Другая сустрэча адбылася ў кабінеце беларускай літаратуры, калі і вырашыў канчаткова, што падпішуся. І тут таксама ў мяне не атрымалася. А ў першай палове гэтага навучальнага года да нас у клас на ўроку беларускай мовы завітаў пісьменнік, сябра ТБМ Рыгор Шундрык, які і падпісаў мяне ад імя ТБМ. Я прапаную даць аб'явы ў газеты большага накладу, напрыклад, "Звязда", "Рэспубліка", "Народная газета", "Чырвоная змена".
2. У жыцці я часта сустракаюся з фактамі, якія сведчаць аб смеласці людзей. Узяць хаця б прайшоўшы перапіс насельніцтва: людзі пераканаы аб яго справядлівасці. Таму я прашу звярнуцца з заклікам да чытачоў напісаць аб парушэннях пры перапісе ў дзяржаўныя СМІ.
3. Я хацеў бы ўступіць у ТБМ. (Мне 16 гадоў). Чуў пра маладзёвую арганізацыю Таварыства. Раскажыце, калі ласка, аб гэтым на старонках газеты.
4. Нядаўна пачуў аб тым, што ёсць прапановы друкаваць у "Нашым слове" правілы, або нормы правапісу дарэфармаванай беларускай мовы. Я выступаю ў падтрымку гэтай ініцыятывы.

Вось і ўсё. Да пабачэння!

Дарагія беларусы!

Звяртаюсь да вашых сэрцаў!

Большасць жыхароў Менска – гэта людзі, якія нарадзіліся ў вёсках ці праводзілі лета ў бабуль. Ці даўно вы былі ў родных мясцінах? Пабывайце там. Успомніце прыгажосць гэтых куточкаў. Успомніце, як хадзілі па мяккай траве, любаваліся лесам, рэчкай, кветкамі. Успомніце голас роднай матулі і бабулі, прыгажосць нашай мовы, нашых беларускіх песень. Іншыя народы будуць паважаць нас, калі мы будзем паважаць самі сябе. Любіце сябе, любіце свой народ, любіце сваю культуру. Чытайце беларускія кнігі, беларускую паэзію. Бывайце ў бібліятэках, музеях, тэатрах. Помніце, — мы – народ, мы нацыя не горшая за іншых. Нам ёсць чым ганарыцца. Гісторыя наша славутая, людзі нашы праславіліся ва ўсім свеце добрымі справамі. Ганарыцеся, што вы – беларусы. Не губляйце гістарычнай памяці. Калі мы беларусы, родная мова наша – беларуская і ў хаце мы размаўляем па-беларуску.

Кацянкова Вольга г.Менск.

Добры дзень, паважаная рэдакцыя газеты "Наша слова"!

Прыемна чытаць Вашу газету, атрымліваць аб'ектыўную інфармацыю. Асабліва карысным лічу для сябе рубрыку "З чужой моўнай практыкі", дзе даецца тлумачэнне тым беларускім словам, якія павінны ўжывацца замест русізмаў.

Зараз трэба вялікая вытрымка, каб усюды гаварыць па-беларуску. Губляецца аблічча нацыі, губляецца з-за таго, што многія саромеюцца сваёй мовы, забываюць яе і смяюцца з яе. Беларусы аказаліся такімі шчодрымі, што адмовіліся, па сутнасці , ад сваёй мовы. Толькі павага да мовы, гісторыі і культуры свайго народа дасць адчуць нам сябе сапраўднай нацыяй, мы пачнём паважаць саміх сябе, а значыць і іншыя нацыі нас будуць больш паважаць.

Без сваёй мовы народ – не народ, а нейкі безаблічны натоўп людзей, якія не змогуць самастойна вырашаць свае праблемы. Такім народам лёгка кіраваць. Нездарма ў тыя часы, калі Беларусь была ў складзе Польшчы ці Расейскай імперыі, наша мова была пад забаронай. Беларусам давалі зразумець, што няма такой мовы – беларускай, што гэта сапсаваны дыялект польскай ці расейскай мовы. Беларусаў называлі тутэйшымі. Нашым продкам давалі зразумець, што яны самастойна, без іншай дзяржавы (Польшчы ці Расеі ў першую чаргу) не змогуць існаваць, не змогуць жыць. І ў нас гэтая думка, мабыць, сапраўды перадавалася з генамі з пакалення ў пакаленне, таму што дзе яшчэ ў якой краіне свету можна ўбачыць такія абыякавыя адносіны да роднай мовы.

Таму зараз кожны свядомы беларус павінен рабіць усё тое, што дазваляюць яго сілы, яго энергія. Рабіць усё магчымае, што ад нас залежыць, каб захаваць сваю мову.

Паважаная рэдакцыя! У мяне да Вас просьба. Дапамажыце мне, калі ласка, набыць кнігу Васіля Быкава "Сцяна" і, калі ёсць яго яшчэ якія апошнія зборнікі, то і іх. Я заплачу, колькі трэба. Ведаю толькі, што адзін яго твор будзе друкавацца ў "Полымі"!

Кавальчук Валянцін.

Паважаная рэдакцыя "Нашага слова"!

Нясцерпны боль за сённяшняе становішча нашай зямлі, роднай Беларусі, і пакутная трывога за яе будучыню з'явіліся прычынай для напісання майго артыкула. І мне вельмі хацелася б, каб у вас знайшлася магчымасць надрукаваць яго на старонках "Нашага слова". Дзякуй вялікі.

Да народа праз мову

Чаму так здараецца, што мы, беларусы, жывучы на сваёй роднай зямлі, не ведаем сваёй мовы, ні культуры? Мабыць таму, што з дзяцінства не прывучаны бачыць харство роднага краю, яго багацці. Дастаткова паглядзець на сённяшнюю моладзь. Разбэшчанасць, вульгарнасць, жорсткасць, абыякавасць, знявага да старэйшых пануюць цяпер усюды. А ці задумваўся хто, чаму так здарылася? Чаму не прызнаюць яны ні сваёй мовы, ні народа, да якога належаць, чаму не паважаюць краіну, дзе раслі і гадаваліся? Няўжо тыя пакуты, здзекі, што цярпелі нашы продкі былі дарэмнымі?

Калі мы хацелі, нам забаранялі размаўляць на сваёй роднай мове. А цяпер, не маючы падмацавання, яна пачынае гібець і павольна гінуць. І толькі паэты, пісьменнікі засталіся адданымі сваёй Радзіме. Іх творчасць-невычэрпнае натхненне гарачай любові да роднага краю, да каранёў сваіх, да народа свайго. Таму нам так цікавы сустрэчы з такімі людзьмі. Сяргей Грахоўскі, Генадзь Бураўкін, Ніл Гілевіч, Уладзімір Арлоў – вось тыя, хто прымусіў мяне зірнуць на свет расплюшчанымі вачыма.

Гэтыя людзі, бачачы, што гібее душа беларуса, што знікае пявучая, прыгожая, пяшчотная мова, заклікаюць нас не цурацца, а абараніць яе. Бо знікне мова – знікне ўся беларуская нацыя. А гэтага нельга дапусціць.

У разнастайным працэсе жывой рэчаіснасці яны вылучаюць сферу побыту, свет штодзённых людскіх клопатаў і турботаў, узаемаадносін паміж людзьмі. Быт для іх – сродак даследвання чалавека, раскрыццё ягонай сутнасці, душэўнай дабрыні. Стан чалавека, яго душэўныя радасці і пакуты – усё гэта пераносяць пісьменнікі, паэты на старонкі сваіх твораў.

А ці памятае хто, як прыемна і хораша становіцца на душы пасля прагляду спектакля, напрыклад, у Купалаўскім тэатры? Менавіта там мы знаёмімся з гісторыяй, асаблівасцямі нацыянальнага побыту, традыцыямі нашага народа.

Мы разумеем, што мілагучная, звонкая мова, на якой размаўляюцьакцёры, дадзена нам ад маці, як найдаражэйшы скарб. І як прыемна спасцігаць духоўныя багацці нацыянальнай і сусветнай культуры на мове нашых бацькоў!

Таму я вельмі хачу, каб у нашым жыцці гэтых сустрэч, знаёмстваў было, як мага больш. Бо яны натхняюць нас на высокія пачуцці. І мы усведамляем, што жывём на сваёй роднай зямлі, і іншая нам не патрэбна.

Таццяна Аўраменка,
студэнтка 18 групы БДТУ.

Добры дзень, шаноўнае "Наша слова"!

12 студзеня г.г. я паглядзела на беларускім тэлебачанні перадачу "Сёння з вамі". І быў з намі міністр адукацыі сп.Стражаў В.І. Сустрэча наколькі неабходная, на столькі і горкая. Горкая ад таго, што і заг. дзіцячага садка, і дырэктар пачатковай школы, амаль усе супрацоўнікі школы (не магу іх назваць настаўнікамі, гэта проста вучыцелі) – усе бавілі час на расейскай мове. Я вось думаю, а чаму міністр адукацыі адказваў ім на мове суседняй дзяржавы? Мо ён ведаў, што яны такія няўцямлівыя і не зразумеюць, калі ён адкажа на тытульнай мове нацыі? Успомніла я чамусці расейскіх класікаў 19 стагоддзя, герої раманаў якіх паміж сабой вялі размовы толькі па-французку, а з халопамі (чэляддзю) размаўлялі па-расейску, бо халопы не разумелі французкай мовы. Напэўна і гэтыя вучыцелі, як і тыя халопы, не здольны зразумець шляхетнай, вытанчанай, высокароднай беларускай мовы, бо, ведама ж, беларуская мова – гэта мова Еўропы, як і французкая. Таму і вымушаны паважаны спадар міністр адукацыі адказваць так, каб яго зразумелі.

Я ўсведамляю розны сацыяльны статус мой і міністра адукацыі. Як чалавек працавіты, паважаю і навуковыя працы міністра адукацыі. Але ж я грамадзянка Рэспублікі Беларусь і лічу, што не да твару міністру адукацыі рабіць выгляд, што не бачыць бядотнага становішча мовы, назву якой носіць краіна. Калі ў нас законам уведзена роўнасць моў, то трэба ж так і рабіць. Амаль усе пытанні спецаў адукацыі былі на расейскай мове. Каб дасягнуць роўнасці, адказы павінны былі гучаць на беларускай мове, а не патураць невукам ад адукацыі.

Самае дзівоснае напрыканцы. Паступіла прапанова налічваць дадатковую заробную плату выхавацелькам садкоў за навучанне замежнай мове. Ну што ж, за лёс французкай мовы на Беларусі можна не хвалявацца. Тут усё ў парадку. А ці не было б лепей гэтую плату налічваць за навучанне беларускай мове на Беларусі?

Л.Судзілоўская.

Прарокі звярнутыя ў мінулае

Самым хвалюючым і непрадсказальным з'яўляецца будучае чалавецтва. Ва ўсе часы людзі спрабавалі прыадчыніць таямнічую заслону, што хавае ад іх будучыню, і зазірнуць туды. Але ж няма, напэўна, больш пэўнага спосабу мяркаваць аб будучыні, як па падзеях дзён мінулых. Сапраўдны прарок той, хто ведае і памятае сваё мінулае, бо ён не асуджаны зноў перажываць мінулых памылак... Людзі, якія вывучаюць гісторыю чалавецтва, якія звязалі сваё жыццё з гэтай навукай , — будучыя гісторыкі. Якія яны? Чым жывуць і як жывуць? "Студэнт гістарычнага факультэта БДУ – гэта гучыць ганарова," так лічаць самі студэнты.

Безумоўна, аб прэстыжнасці гэтай прафесіі ў матэрыяльным плане гаварыць не даводзіцца, але на ўступных іспытах конкурс перавышаў пяць чалавек на адно месца. Гэты факт гаворыць, калі размаўляеш са студэнтам-гісторыкам, адразу разумееш, як глыбока ў ім укараніліся ідэі нацыянальнай самасвядомасці, агульначалавечага гуманізму і, безумоўна, гонару за свой народ. Гэтыя маладыя людзі з захапленнем і павагай размаўляюць на роднай беларускай мове. Для іх яна самая прыгожая і мілагучная ў свеце.

Гледзячы на іх, мацнее вера ў лепшую будучыню роднай Беларусі, у тое, што час разбурэння блізіцца да завяршэння. Моладзь, адданая нацыянальнай ідэі , вера і надзея нашай Бацькаўшчыны, прарокі, звернутыя ў мінулае.

Нікіцюк Ірына,
студэнтка БДУ гістарычнага факультэта.

НЕ ПОЛЕ ПЕРАЙСЦІ

Дакументальны аповед Рыгора Шавуры

(Працяг. Пачатак у папярэднім нумары.)

Мне здавалася, што засну адразу, як толькі на сваёй паліцы прыму гарызантальнае ўлежышча . Але праходзіла паўгадзіны, гадзіна, заснуць не даводзілася. Розныя думкі лезлі ў галаву. Усё да падрабязнасцяў успаміналася пра нашу паездку, уражанняў назбіралася шмат. Кожны з нас ведаў, колькі клопатаў прыйшлося вынесці Алене Іосіфаўне, каб ажыццявіць вось гэтую паездку. Мастацкія прыналежнасці "прабівала" праз Саюз мастакоў, у магазіне ж не купіш. Дамаўлялася з машынай у Гомельскім доме самадзейнай творчасці, з намі – няштатнымі кансультантамі, мастацтвазнаўцамі. Ішла ў Белсаўпраф, у другія інстанцыі, каб паклапаціцца аб матэрыяльнай дапамозе чалавеку, які так адчуваў патрэбу ў гэтым. І не аднаму толькі Міхасю Засінцу. У рэспубліцы армія народных майстроў і самадзейных мастакоў вялізная – не адна тысяча. Колькі ж патрабавалася часу, энэргіі, каб трымаць пастаянна ў полі зроку бадай што кожнага майстра, кіраваць працэсам усяго развіцця мастацкай самадзейнасці. Алена Іосіфаўна, нягледзячы на свой даволі немалады ўзрост, знаходзіла і час, і сілы, каб сваечасова прыйсці на дапамогу чалавеку, падбадзёрыць яго, натхніць на творчыя пошукі, падтрымаць цеплынёй свайго сэрца. Менавіта любоў да людзей, прага быць неабходнай і карыснай для іншых давалі ёй сілы ў працы і ў жыцці.

РАДКІ З БІЯГРАФІІ

А жыццё Алены Іосіфаўны – гэта цэлая эпоха, гэта гісторыя, неад'емная ад жорскіх, суровых і трагічных катаклізмаў чалавечых лёсаў, усяго нашага народа.

Нарадзілася Алена Іосіфаўна ў Барысаве, у сям'і рабочага. У падростковым узросце асірацела разам з меншымі сястрычкамі і братам. Бацьку забілі ў 1919 годзе бандыты, а маці, якой споўнілася толькі 27 год, памерла. На выхаванне ўсіх іх узяў дзядзя. Матэрыяльнае становішча такой вялікай сям'і было да крайнасці цяжкім. Першыя гады рэвалюцыі. У краіне – разруха, голад. Хлеб пяклі з жалудовай мукі. Ён быў горкім як палын, каляным, есці было проста немагчыма. Але елі каб не памерці з голаду. Летам было лягчэй. Збіралі шчаўе, ледзь завязваліся яблыкі, ці якая-небудзь ягадзіна, ўсё ішло ў ежу. Не было і адзення, абутку. Даводзілася насіць паношаную вопратку, ды і не па памеру. Не было дзе купіць, не было і сродкаў на гэта. Неўзабаве здарылася бяда. Страшэнны пажар некалькі дзён бушаваў у горадзе. Згарэла амаль што паў-Барысава, у тым ліку хата і ўся маёмасць дзядзі. Засталіся бадай што толькі з тым, у чым былі апрануты. Давялося для жылля ладзіць зусім не прыстасаванае памяшканне. Бытавыя цяжкасці абвастрыліся да крайнасці. "Усе мы ад мала да вяліка шукалі выхад з такога крызіснага стану, усяляк змагаліся за жыццё", — успамінала Алена Іосіфаўна. Працавалі, кожны рабіў, што мог. Памерлі двое сясцёр. Засталіся малодшыя сястра і брат. І ўсё ж, як бы не было цяжка, Алена вучылася у школе, дапамагала дзядзю па гаспадарцы. Час ішоў. Скончыла дзесяць класаў, паступіла ў педагагічны тэхнікум. Пасля другога курса тэхнікума пайшла працаваць настаўніцай у пачатковую школу ў Пячах (пад Барысавам), потым у вёсцы Старынкі Лагойскага раёна. Жыццё паціхеньку наладжвалася. У 1924 (25) годзе пазнаёмілася са сваім будучым мужам. Тады ён – камандзір артылерыйскага батальёна – нейкі час кватараваў у хаце дзядзі – Нагорнага Андрэя Вікенцевіча. Алена прыязджала з сваёй настаўніцкай работы на выхадны дзень дамоў, вось тут яны і сустэліся. Але іх знаёмства было не такім ужо простым. Ганарлівы характар Алены не дазваляў так хутка і проста пакарыць яе сэрца вось гэтаму падцягнутаму, у высокім чыне вайсковаму чалавеку. Падабаўся і ён ёй, ды ці ж можна было так проста адкрыць свае асабістыя пачуцці? Колькі разоў прызначаў спатканне, усё не адважвалася. Але аднойчы ногі самі панеслі туды, дзе сярод векавых дрэў чакаў ён. А які абутак тады быў. Чаравікі зберагала, ішла басанож, і толькі перад самым месцам сустрэчы абувалася. Але ж на душы было хораша, навакольны свет здаваўся цудоўным.

Прайшоў нейкі час, Алена і Міхаіл пажаніліся. З гэтага часу пачалося новае жыццё, якое напаўнялася надзвычай разнастайнымі яго адценнямі і праявамі. Полк, у якім служыў муж, перавялі ў Бабруйск. Туды паехала і Алена. Жыццё ў Бабруйску, а тым самым і служба мужа, не былі аседлымі, пастаяннымі. Прайшло некалькі часу, пераехалі ў Віцебск . тут у 1926 годзе ў іх нарадзіўся сын Вова. У той час бальніца (роддом) знаходзілася на правым беразе Дзвіны. Гэтае памяшканне захавалася і да нашых дзён. Колькі добрых успамінаў і разам з тым слёз прыносілі Алене Іосіфаўне тыя мясціны, калі яна прыязджала ў Віцебск ужо потым праз дзесяцігоддзі? Але не будзем забягаць наперад. Працягнем наш аповед далей, у той час, менавіта пра тое, калі шчасце, радасць і добры настрой былі заўсёды побач. Маладосць, надзеі – усё было для іх – Алены і Міхаіла.

Праз два гады зноў вярнуліся ў Бабруйск. Пачалі абжывацца. Падрастаў сынок. Здавалася, нічога іншага і не трэба. Ды вось зноў у дарогу. Цяпер шлях ляжаў у Днепрапятроўск. Мужа прызначылі камандзірам 30 артпалка 30-й артылерыйскай дывізіі. Наступаў самы цікавы і самы трагічны перыяд у жыцці Алены Іосіфаўны. А цікавым і да пэўнай пары шчаслівым быў перш за ўсё таму, што ў жыцці вельмі добра і прыгожа ўсё складвалася. Атрымалі добраўладкаваную кватэру. Здаровым і жвавым падрастаў сын Вова. Ды і сама Алена без справы не заставалася. За гэты, днепрапятроўскі перыяд яна скончыла 2-х гадовыя курсы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва і трохгадовыя курсы стэнаграфістаў, што вельмі прыдалося ў далейшым жыцці. Пасля заканчэння курсаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва некалькі год кіравала гуртком вышыўкі сярод жонак афіцэрскага складу. Арганізоўвала выставы работ майстрыц, актыўна ўдзельнічала ў мастацкай самадзейнасці. Добра памятаецца неардынарная падзея ў жыцці складу 30 артылерыйскай дывізіі, калі прыязджаў М. І. Калінін, уручыў узнагароды афіцэрам і чырвонаармейцам падраздзяленняў.

Вельмі прыгожа і ўрачыста сустракалі мясцовыя ўлады жонак-дэлегатак у Днепрапятроўску. Пад'ехалі машыны, духавы аркестр, кветкі, кветкі... Не было мяжы радасці, шчасця, жыццёвага ўзлёту. Здавалася, так – на ўсё жыццё. Але не ведала ў гэты выдатны і шчаслівы дзень Алена Іосіфаўна, што роўна праз год здарыцца катастрофа, якая стане пачаткам страшэннай трагедыі, усім зместам незаслужана прыніжэння чалавечай годнасці, горам і бязмежнымі пакутамі.

Але гэта яшчэ толькі праз год. Сёння ж радасна і прыгожа на душы. Ці ж можна было думаць аб чымнебудзь дрэнным, калі навокал жыццё, здавалася было на новым уздыме. Такія адбываліся змены: пабудова сацыялізму, прыняцце новай, Сталінскай Канстытуцыі, паспяховыя этапы індустрыялізацыі краіны, калектывізацыя... Дзяржава саветаў сямімільнымі крокамі рухалася да новага прагрэсу.

Не менш турботным жыццём была і служба ў Савецкай Арміі. Традыцыйнай і адпрацаванай на працягу доўгага часу заставалася кампанія летніх лагерных раскватарвання вайсковых частак і гарнізонаў. Полк, якім камандаваў муж Алены Іосіфаўны, некалькі год у летні перыяд дыслакаваўся ля Паўлаграда. Там праводзіліся вайсковыя вучэнні, адпрацоўваліся стратэгія і тактыка ўзаемадзеяння розных родаў войскаў, выпрабоўвалася баявая тэхніка.

Вяртаючыся з летніх лагераў, муж доўга і шмат расказваў аб розных эпізодах, падзеях, людзях і іх турботах. Шмат што насцярожвала, не ўсё станавілася зразумелым. Столькі вялося гаворкі аб "ворагах народа", якіх станавілася з кожным часам усё больш. Чуткі пашыраліся ўсюды. Сярод "ворагаў народа" сталі з'яўляцца людзі вядомыя, заслужаныя ў грамадстве. Неўзабаве "ворагамі" станавілія добра знаёмыя, калегі і таварышы. Аднойчы на адным сходзе палка краснаармейцы задалі пытанне мужу Алены Іосіфаўны:

—Таварыш камандзір, вось вы служылі ў арміі яшчэ ў першую імперыялістычную. Скажыце, як тады, ды і асабліва ў грамадзянскую, ваявалі ворагі народа?

Красічкаў Міхаіл Захаравіч адказаў:

—І ваявалі, і перамагалі!

Гэты адказ на пытанне сярод зацікаўленых у кампраматацыі аўтарытэту камандзіра людзей паступова набываў адметную афарбоўку. Пашыраліся чуткі аб тым, нібы камандзір палка ўсхваляў ворагаў народа. Наступаў перыяд нейкай незразумелай нясцярожанасці. Дзесьці хто штосьці гаварыў, што як сказаў... Усялякія дробязі, падазроныя і нікчэмныя запаўнялі прастору ў адносінах паміж людзьмі. У кожнай гаворцы, слове шукалася тое, што можна было паднесці ў адпаведных абставінах, як кампраматны доказ перад грамадствам зусім сумленнаму і ні ў чым не вінаватаму чалавеку.

Збіраліся хмары і над камандзірам. На працягу некалькіх год вялося сяброўства з сям'ёй намесніка начальніка палітаддзела палка Румянцава. Часта бывалі адзін у другога, шчыра абменьваліся думкамі, разважалі. У адной з такіх сустрэч Красічкаў сказаў:

—Якія зараз творацца справы, дзіву даешся. Сёння можна заснуць пры адной ўладзе, а прачнуцца – пры другой. Цяжка разабрацца!..

Праз пэўны перыяд Румянцаў далажыў на партыйным бюро тое, што сказаў камандзір. Тут жа пачаліся разбіральніцтвы і вынікам усяго гэтага стала выключэнне Красічкава з партыі. Цяжка перадаць словамі, які душэўны і псіхалагічны ўдар разануў па чалавеку, на рэдкасць фізічна моцнаму, заўсёды ўраўнаважанаму і стрыманаму. Гэты ўдар выбіў з каляі, паставіў у вельмі складанае становішча камандзіра перад падначаленымі, знаёмымі, блізкімі. Кваліфікацыя матываў выключэння з партыі была недарэчнай і абсурднай. Столькі сіл, досведу, добрасумленнага служэння гэтай жа партыі, народу і ўрэшце аказаўся нейкім злачынцам, пры тым злачынцам самай сур'ёзнай небяспечнасці. Не хацелася верыць, але падзея адбылася, яе неабходна прымаць. Цяжка перажывалася. Становішча з цягам часу ўскладнялася. Пачалася рознабаковая траўля, ганенне, высвятленне спраў...

І вось, 14 кастрычніка 1937 года, у дзве гадзіны ночы раздаўся пранізлівы званок. Алена Іосіфаўна адчула трывогу, так ранней ніхто не званіў. Яна звярнулася да мужа і кажа:

—Гэта да цябе.

Муж выйшаў з кватэры і доўга не вяртаўся. Калі ён вярнуўся, яна зразумела – прыйшоў час арышту. Ён падышоў да Алены Іосіфаўны і глыбока і цяжка ўздыхнуўшы прагаварыў:

—Падай імянную зброю, патрабуюць.

Алена Іосіфаўна выняла з камода "Браўнінг". У гэты час у пакой ўвайшлі міліцыянер, упаўнаважаны НКУС і кіроўца машыны. Яны раптоўна схапілі яе за рукі і вырвалі пісталет. Затым упаўнаважаны паспрабаваў адарваць у мужа пятліцы, але ён адштурхнуў яго і моцна ўскрыкнуў:

—Не ты мне іх вешаў. Я ваяваў, калі ты пад стол пешкам хадзіў.

Міхаіл Захаравіч апрануўся і стаў развітвацца з сям'ёй. Сын Воўка і Алена Іосіфаўна прытуліліся да яго і запрычыталі. "Тройка" прыспешвала да выхаду.

Адыходзячы да дзвярэй камандзір павярнуўся да жонкі з сынам і прагаварыў:

—Не вер нікому, беражы сына. Заўсёды ведай, я чысты перад людзьмі, партыяй, Радзімай...

Яны выйшлі. Неўзабаве следчы вярнуўся і запатрабаваў ад Алены Іосіфаўны падпіску аб нявыездзе і яна падпісалася.

У двары загрымела машына, і менш, як праз паўхвіліны, яе шум заціх дзесьці ўдалечыні. Спаць ужо ў гэтую ноч не давялося. Сэрца адчувала бяду. Усё думалася, думалася, зноў усё перабіралася ва ўспамінах. Не было за што ўчапіцца, каб адшукаць хоць якую-небудзь віну перад законам. Так хацелася верыць, што гэта памылка, што праз дзень-другі вернецца муж. Усялякае здарасцца ў жыцці, а тым больш памылкі...

Раніцай Алена Іосіфаўна, устрывожаная і панурая выйшла на вуліцу. Вось тут стаяла машына, адсюль яна павезла мужа. Куды, навошта, надоўга? Некаму, ды і немагчыма было адказаць на гэтыя пытанні. Зноў вярнулася ў кватэру. На шляху сустрэла суседку, тая не прывіталася, зусім адвярнулася і пайшла. У пакоі ўсхліпваў сын. Дзесьці наверсе патэфон круціў грамафонную пласцінку. Гучала песня "Живём сегодня весело, а завтра будет веселей...". Алена Іосіфаўна абняла сына і ў адчаі заплакала. Цягнуліся горкія і пікчэмныя дні існавання. З дня на дзень чакала хоць якой-небудзь весткі ад мужа. І бадай што не дарэмна. Не прайшло і два тыдні, як зазваніў тэлефон. Міхаіл Захаравіч перадаў сыну (Алена Іосіфаўна адсутнічала ў гэты час), што ён знаходзіцца ў турме, і каб маці тэрмінова напісала пра ўсё гэта Сталіну, бо абставіны складваюцца так, што ніхто іншы дапамагчы не зможа. Толькі потым Алена Іосіфаўна падумала, як жа можна было патэлефанаваць з турмы? Напэўна падарыўся рэдкі выпадак і муж яго выкарыстаў. Ліст вялікі і шчыры быў напісаны адзінаму "спасіцелю" народа, дарагому Іосіфу Вісарыёнавічу. Шлях яго да канкрэтнага адрасата стаў бязмерна доўгім, бясконцым і безваротным.

(Працяг у наступным нумары)

Беларускае слова: Самсон Пярловіч

Паднімецца крыўда

І ноччу і днём падхалімы скуляць
Пра росквіт жыцця, пра свабоду.
Ад і этай "свабоды" аж стогне зямля.
А ў росквіце тым – смерць народу.

Тыран – дэспат Сталін старых і малых
Запрогшы ў прыгонныя ёрмы,
Нявіннай крывёй суцяшае іклы,
Каму колькі жыць – ставіць нормы.

Людзей, каб прымусіць пакорна маўчаць
Пад страхам, як вязняў бяспраўных,
Са зграяй сваёю пачаў вынішчаць
Народа сыноў самых слаўных.

А каб заглушыць і праклёны, і боль,
Кляймом страшным – "Вораг народа"
Кляймяць чалавека, ды ўсё што раз больш
Знішчаюць людзей з кожным годам.

Калі б удалося ўсе косці сабраць
Усюды, дзе палі ахвяры,
З касцей тых, напэўна, паўстала б гара,
Што рвала б вяршыняю хмары.

А слёзы і кроў, што замучаны люд
У горы бязлітасным выліў,
Калі б не праніклі ў матулю-зямлю,
І сонца, мабыць, патушылі б.

Ці ж выцерпіць крыўда? Мільёнам галоў
Яна яшчэ грозна паўстане!
Хіба хто апошнім сумленнем аглох,
Той толькі мо сцерпіць маўчанне!

Нясмяротная Пагоня

Святая, грозная Пагоня,
Век Беларусь ты бараніла,
Таму ў трывожны час і сёння,
Ты – гонар наш і наша сіла.

Падчас, у жудасным бяздонні
Хоць сілы нас і пакідалі,
Твае і рыцары, і коні
Зноў дух на бітву паднімалі.

Малюся, хоць няхай і злягу,
Каб вечна велічнай выявай
Пад Бел-чырвона-белым сцягам
Ты ззяла над усёй Дзяржавай.

Грамі захопнікаў і здраду!
Удар твой Богам бласлаўлёны,
Бо служыш нам не для нападу,
А сужыш нам для абароны.

ЧАРАДЗЕЙНЫ АГОНЬ

Самсон Пярловіч

Паэзія і мастацкая проза

г. Навагрудак
1997 г.

Наваградак

Ты – Наваградак, ты – Наваградак,
Мой гарысты горад дарагі.
Дзе б ні быў я, па табе мне ўсюды
Сэрца замірае ад тугі.
Кліча, вабіць здзірванелы Замак,
Люстра Свіцязі штоночна сню.
І Курган Міцкевіча Адама
Рассцілае мне далечыню.
Аніяк душа не наглядзіцца,
Як вянком блакіцяцца лясы.
Вецер праз шчарбатыя байніцы
Нам даносіць продкаў галасы...
Быў жа ты калісьці і сталіцай.
Строма ўзняты між лясоў і ніў,
Замак твой ад дзікіх чужаніцаў
Родны край надзейна бараніў...
Ты і сёння, як крыло надзеі,
Абагрэты сэрца цеплынёй,
З кожным днём расцеш і маладзееш,
Непаўторны летам і зімой.
І крылатай песняю бадзёрай
Над табой праносяцца гады...
Мой гарысты шматвяковы горад,
Ты душою вечна малады.

"Шылам брыты"

За лясамі, за барамі,
Ходзіць вецер вечарамі,
Цераз рэкі, цераз нівы
Нам прыносіць казкі-дзівы.
І вось гэту (хоць не казка)
Ты паслухай, калі ласка.
Было гэта даўнім часам,
Калі елі бульбу з квасам...

Дзядзьку захацеў адведаць.
Дзе ён жыў– добра не ведаў.
Прабіраўся пехатою
Да той вёсачкі глухое
З дзіўнай назваю Кульбакі –
Трапіць мог туды не ўсякі.
Апынуўся надвячоркам
За дзесятым можа ўзгоркам
І ля крайняе там хаты
Напаткаў дзяцей мурзатых,
Ды пачаў у іх пытацца,
Як да Ціхана прабрацца?
Тыя хорам мне гукнулі:
—Пра яго мы і не чулі!
Ад Крывога да Касога
Тут у нас няма такога!
Я тады ім растлумачыў –
Дзядзьку помніць
хто пабачыў,
Бо твар воспаю пабіты.
—Ах, дык гэта
Шылам брыты!—
Падшываны закрычалі,
Зашумелі, заскакалі,—
—Так адразу і кажы ты,
Што твой дзядзька
Шылам брыты!
Закрычаў я:
—Ліхадзеі,
Мабыць вы павар'яцелі.
Ён жа слаўны, працавіты!
А яны мне:
—Шылам брыты!
Сцяміў я, што
ў тых мясцінах
Не завуць, як на хрысцінах,
Ці пасля...
Але за вочы –
Так, як брахануў аднойчы
Грубіян непрызваіты.
Так стаў дзядзька –
"Шылам брыты".

Аб сустрэчы крывавай з эмдэбістам Цанавам

Як забойца – наган
Сваім вокам смяртэльным,
Аўта-чорны груган
Сваім здзекам пякельным
Нават бачыцца ў сне,
То здалёку, то зблізку...
Мяне ў тым "гругане"
Валачылі па Мінску,
Бы ў забітай труне,
Да сустрэчы крывавай
Набліжаў ён мяне
З эмдэбістам, Цанавам,
Жар мне сэрца паліў,
Слеплі вочы ад мукі,
Пот змахнуць не маглі
Закаваныя рукі.
А пасля гнаў канвой –
Уцячы немагчыма –
Двух было прада мной,
Ды і двух за плячыма.
У іх прывід не гас,
Што з уцёкам я ў змове –
Аўтаматы ўвесь час
Неслі напагатове.
Аж нарэшце ўсплыў гмах
І паверх той паднебны.
Кайданы на руках
Не былі больш патрэбны.
Дык паспешна іх тут
Канваіры зрывалі.
Для далейшых пакут
Вязня ў залу загналі.
Там, бы кроў, дываны
Ззялі бляскам чырвоным,
А навокал чыны –
Залатыя пагоны.
Помню: пульс не дрыжыць
На руцэ малакроўнай,
Бо – памерці, ці жыць –
Мне было ўжо ўсё роўна.
Так стаяў, маладзён,
Бледны я, безвалосы.
У цывільным жа ён
Уляцеў, гарбаносы.
Бы каршун, бы сава,
З барадаўкаю велькай –
Лысая галава,
Пуза пад камізэлькай.
Заскакаў з кута ў кут,
Ды ўсё рукі разводзіў,
Быццам страшных пакут
Мне ніяк не знаходзіў.
Той, пра Сталіна, меў
Верш мой у цэлафане,
Ды раз-пораз грымеў
Вось такое пытанне:
"Як ты смеў! Гаворы!
Так біць "бацьку народаў"?!!
Цешыўся б, каб стварыў
Яму некалькі одаў.
Заслужыў жа – турму!
Вось табе і адплата"!
Адказаў я яму:
"Не магу славіць ката".
Зашыпеў, бы змяя,
Ён тады, ды стаў енчыць.
Мабыць, прагнуў, каб я
Стаў маліцца, ды кленчыць.
Уяўляў, мабыць, як
Будзе з хеўрай дзівіцца,
Калі, быццам чарвяк,
Каля ног пачну віцца,
Літасць каб аказаў
Ды жыцця не пазбавіў,
Каб упала сляза,
Каб цяпер хоць іх славіў.
Нат здзіўлёна глядзеў
І зноў рукі разводзіў.
І мясцечка нідзе
Зноў сабе не знаходзіў.
І прыкметна, бы раб,
Гнеў суняць свой стараўся.
Пра той верш, каб хаця б
Сталін сам не дазнаўся.
Злыдзень ведаў даўно –
Хто пра "Бацьку" са злобай
Чуў хоць слова адно –
Знішчыць кожнага "Коба".
Дык, нарэшце, як мыш,
Ды ўжо і не па-руску
Піскнуў: "Што ты маніш"?!–
Гэтак па-беларуску.
Хітра тым знак ён даў:
Мову цэніць, не бэсціць...
Пра мяне ж загадаў:
"Закаваць і адвесці"!
Па завулках пачаў
"Воран" зноў свае танцы.
Ізноў карцар чакаў
Мяне ў "Амерыканцы".
Хай даўно ўжо няма
Валадарскага тога,
З яго імем турма
Людзей душыць, ой многа!..

А пасля ў халадах
Зноў этапы, гулагі,
Дзе ў бясконцых лядах
Лёс клянуць дахадзягі.
Дошкі мулкія нар,
І крык дзікі канвоя...

Памяць сэрцы ахвяр
Болем век беспакоіць.

Давайце спяваць па-беларуску

Зьміцер Бартосік

Ахвярую Г.П.

Белы шалік

Раманс

AM *DM*
Шалік белы з чырвонаю стужкай
E *AM*
Ты аднойчы мне ў дар паднясла
DM
Як сымболь нашай шчырае дружбы,
AM *DM*
Талісман нашых будучых спраў.

A *DM*
Ты яго мне сама вышывала,
G *C*
Каб было мне напэўна цяплей
F *DM*
Ты сама мне яго павязала,
E *AM*
Ў дзень, калі павязалі мяне.

Не пісаў я на сьценах тых матам,
А прысьпешваў, здавалася мне,
З дапамогай вялікай цытаты
Залацісты і ясны наш дзень.

Ды мае паэтычная густы
Не ўлічыў той сухі пратакол,
Быццам я аднаго беларуса
Абзываў там, дзе мог, мудаком.

І зрабіўшы масаж мне на твары,
Шалік той ад мяне унясьлі.
Каб былі мне больш мулкімі нары
Й не павесіўся каб ад тугі.

Пацягнуліся дні без навінаў,
Хоць кідаюць газэты зрэдчас.
Ды няма сярод іх "Нашай Нівы",
Безь якой я зусім тут прыгас.

Ды аднойчы празь сьцены і краты
Атрымаў навіну пра цябе.
Быццам, мілая, круціш раман ты
З маладым афіцэрам ГБ.

Ў Батанічным вас бачылі садзе,
А пасьля ў "Гішпанскім кутку",
Як сядала ў ягоны "Фальксваген"
На Камсамольскай з Праспэктам рагу.

Што ж, гуляй са сваім "асабістам".
Веру, што вам ня доўга гуляць.
Дачакаюся й я асабіста
Залацістага яснага дня.

І калі ўсё акажацца праўдай,
Падарунак я твой вазьвярну,
І на шыі тваёй далікатнай,
Шалік той я як сьлед зацягну.

Рэдактар Станіслаў Суднік

Заснавальнік:
ТБМ імя Францішка Скарыны.
Пасведчанне аб рэгістрацыі:
№ 83 ад 28 чэрвеня 1996 г.
Адрас рэдакцыі:
220005, г. Менск, вул. Румянцава, 13.
Адрас для паштовых адпраўленняў:
231300, г. Ліда-2, п/с 7.
E-mail: ns@lida1.lingvo.grodno.by

Рэдакцыйная калегія:
Людміла Дзіцэвіч, Алесь Гурыновіч, Леакадзія Мілаш, Язэп Палубятка, Алесь Петрашкевіч, Лілея Сазанавец, Уладзімір Содаль, Станіслаў Суднік, Павел Сцяцко, Алег Трусаў.

Аўтары цалкам адказныя за падбор і дакладнасць прыведзенай інфармацыі

Газета надрукавана ў Лідскай друкарні.
231300, г.Ліда, вул. Ленінская, 23.
Газета падпісана да друку 26. 07. 99 г.
Наклад 3500 асобнікаў. Замова № 1892 .
Падпісны індэкс: 63865.
Кошт падпіскі: 1 мес.- 40 000 руб., 3 мес.- 120 000 руб.
Кошт у розніцу: 10 000 руб.